

ТРАГЕДЫЯ ДОКШЫЦКІХ ВОГНЕННЫХ ВЁСАК 8–9

РЭЖЫСЁР НІКІФАРАЎ ПРА МАГІЮ КІНО 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ВЕРАСНЯ 2022 г. СУБОТА № 188 (29810)

## КОРАТКА

• Памяць расстраляных фашыстамі 80 гадоў таму выхаванцаў дзіцячага дома ўшанавалі ў Брэсцкім раёне.

• Беларусь плануе пастаўляць у Манголію прадукты харчавання і фармацэўтычныя тавары.

• **Савет ЕЭК прадоўжыў на паўгода дзеянне бяспошліннага ўвозу тавараў для фізічных асоб у памеры 1000 еўра.**

• Кароткае замыканне, уцечка паліва, курэнне: 40 машын згарэлі з пачатку года ў Магілёўскай вобласці.

• **БЧ прызначыла дадатковыя цягнікі ў Расію на пачатак лістапада. Гэта звязана з прагназаваным павелічэннем попыту пасажыраў на білеты ў РФ у перыяд лістападаўскіх свят і восеньскіх школьных канікулаў.**

• Памятны знак у гонар пагранічнікаў усіх пакаленняў адкрыюць у Полацку.

• **Новую малочнатаварную ферму на 600 галоў увядуць у строй у Светлагорскім раёне.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ЛУЦКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Наша галоўная задача — у школе закласці ў дзяцей такія прынцыпы, ад якіх бы яны не адмовіліся ніколі. Гэтыя прынцыпы простыя: любіць, шанаваць, паважаць і быць гатовым ахвяраваць дзеля сваёй Радзімы, дзеля незалежнасці і суверэнітэту. Гэта адзінае, што дазволіць захаваць нашу дзяржаву. І кожны на сваім участку павінен быць нацэлены на тое, каб выхаваць такога грамадзяніна».*

З першых вуснаў

# «ТРЭБА БЕРАГЧЫ СВАЁ, КАБ НЕ БЫЦЬ СПАЛЕНЫМІ Ў ГЭТЫХ АДРЫНАХ»

## Аб чым Прэзідэнт гаварыў у Хатыні

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ходам работ па рэканструкцыі Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», аб'яўленай Усебеларускай маладзёжнай будоўляй. Усе рэстаўрацыйныя работы павінны завяршыцца да 80-годдзя трагедыі — да 22 сакавіка 2023 года: такая задача была пастаўлена кіраўніком дзяржавы ў красавіку падчас рэспубліканскага суботніка, які беларускі лідар правёў у Хатыні. Акрамя таго, да гэтай сімвалічнай даты на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу плануецца адкрыццё музея, які ўзводзіцца з нуля.**

Сам будынак музея, дарэчы, ужо ёсць. На дадзены момант вядуцца аддзелачныя работы. Аднак самае галоўнае і складанае — наперадзе: трэба стварыць экспазіцыю. І на гэта звярнуў увагу Прэзідэнт. Усе шэсць залаў павінны быць напоўнены экспанатамі — такое патрабаванне Аляксандра Лукашэнкі. На гэтым, па яго словах, мусяць быць засяроджаны як мінімум шэсць груп творчых людзей, якія ўжо павінны «бегаць па краіне» ў пошуку экспанатаў. Што датычыцца ў цэлым музея, беларускі лідар адразу папярэдзіў: «Ніякай паказухі! Не дай бог потым нешта павылазіць! Усё павінна быць надзейна. Для людзей».

Па словах Прэзідэнта, наведваючы мемарыяльны комплекс, людзі павінны атрымаць тут такую інфармацыю, каб сэрца разрывалася. Пры гэтым важна захаваць першапачатковы выгляд мемарыяла. «Можна, вядома, зрабіць еўрарамонт, але нам гэта не трэба, — адзначыў ён. — На гэтым месцы была вёска, таму і цяпер усё павінна быць проста і душэўна».

Беларускаму лідару прадэманстравалі апошнія знаходкі, якія выявілі падчас земляных работ на тэрыторыі комплексу. У прыватнасці, асколкі ад гільзы, абгарэлыя камяні, тое, што засталося ад вілаў, нешта падобнае на нацельны крыжык. «Вось і першыя музейныя экспанаты», — заўважыў Прэзідэнт.

Удзяліў увагу кіраўнік дзяржавы і аб'ектам інфраструктуры, і азеляненню тэрыторыі мемарыяльнага комплексу.



Фота БелТА.

Таксама Прэзідэнту паказалі царкву, пабудаваную на тэрыторыі комплексу. Каб тут з'явіўся невялікі драўляны храм — асабістае жаданне Аляксандра Лукашэнкі. У Хатыні калісьці была царква. Храм, які, дарэчы, вядзе свой летапіс з канца XVI стагоддзя, 22 сакавіка 1943 года загінуў разам з усёй вёскай і яго жыхарамі. Пасля вайны пра яго не ўспомнілі. Цяпер жа — і пра гэта сказаў беларускі лідар — будзе нядрэнна, калі з'явіцца такое месца, куды можна зайсці, пакланіцца, паставіць свечку. Такім чынам, кожны зможа аддаць даніну павагі гэтым бедным людзям, якія загінулі ў полымі, распаленым нацыстамі і іх памагатымі. Ушанаваў іх памяць і Прэзідэнт, усклаўшы кветкі да манумента «Няскораны чалавек» і да Вечнага агню каля мемарыяла «Могілкі вёсак».

* * *

**Асаблівай часткай учарашняй паездкі была размова Прэзідэнта з журналістамі. Закранаці самае важнае і надзённае, але месца, у якім гэта гаварылі, усё роўна неаднойчы згадвалася ў адказах кіраўніка нашай краіны, ужо з праекцыяй на сённяшні дзень.**

### «У Беларусі не будзе ніякай мабілізацыі!»

На пачатку прадстаўнікі мас-медыя ўзнялі адну з рэзанансных тэм — новы этап спецыяльнай ваеннай аперацыі Расійскай Федэрацыі ва Украіне, звязаны з частковай мабілізацыяй расіян. СТАР. 2

Камунальныя стасункі

# ТАРЫФЫ ЗАСТАНУЦЦА ДАСТУПНЫМІ

## Эксперты расказалі пра асноўныя кірункі развіцця галіны ЖКГ

**Перадавыя тэхналогіі і напрацоўкі ў сферы ЖКГ паказалі работнікі галіны на I Міжнароднай спецыялізаванай выставе жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Наш дом», якая прайшла на гэтым тыдні ў сталіцы. А падчас васьмі круглых сталоў у яе межах абмяркоўваліся пытанні эксплуатацыі і тэхнічнага рэгулявання жылля, працэсы лічбавізацыі кіравання маёмасцю, падрыхтоўкі кадраў, водазабеспячэння, удасканалення смеццевай галіны, добраўпарадкавання. Падчас выставы прайшла таксама калегія Міністэрства ЖКГ, на якой эксперты агучылі гатоўнасць краіны да зімы і абмеркавалі шляхі будучага развіцця. Эксперты падзяліліся з журналістамі меркаваннямі па стане і развіцці асноўных напрамкаў сферы.**

### Пра ацяпленне і яго кошт

Рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона ў краіне прымаюць мясцовыя ўлады зыходзячы з існуючых умоў надвор'я: сярэднясутачная тэмпература павінна быць ніжэйшай за 8 градусаў на працягу пяці сутак, нагадаў **міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ.**

*— Сёння жыллёвы фонд і кацельнае абсталяванне да пачатку сезона гатовыя. У найбліжэйшыя дні рашэнне будзе прынята, і ў нашы дамы паступіць цяпло.*

Палітыка кіраўніцтва нашай краіны дазваляе мець даволі даступны кошт на энергарэсурсы, таму рэзкага росту тарыфаў, у тым ліку на ацяпленне, не прадбачыцца. Тым больш што ўрадам у чэрвені гэтага года было прынята рашэнне не падымаць тарыфы на цеплавую энергію, што за працяглы час адбылося ўпершыню, удакладніў міністр:

*— Налета, як звычайна, кошт усіх жыллёва-камунальных паслуг будзе расці два разы, як звычайна: 1 студзеня і 1 чэрвеня. Аднак, паводле практыкі, якая склалася, рост тарыфаў залежыць ад даходаў насельніцтва і не перавышае пяці долараў. Такая палітыка і застанецца.* СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

22188

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ТРЭБА БЕРАГЧЫ СВАЁ, КАБ НЕ БЫЦЬ СПАЛЕНЫМІ Ў ГЭТЫХ АДРЫНАХ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Журналісты пацікавіліся, ці не паўплывае гэта нейкім чынам на нашых грамадзян. Пазіцыя Аляксандра Лукашэнкі на гэты конт адназначная: вайна ва Украіне — не наша вайна, і мы ваяваць там не будзем. ***«У Беларусі не будзе ніякай мабілізацыі!*** — заявіў кіраўнік дзяржавы. — ***Гэта хлусня! Мы не збіраемся мабілізоўваць. Нам гэта не трэба!»*** У той жа час кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што ў нашай краіне абавязкова будуць рэагаваць на магчымыя знешнія пагрозы, у тым ліку спробы здзяйснення актаў тэрарызму. Для гэтага на рэгулярнай аснове праводзяцца шматлікія вучэнні, у тым ліку антытэрарыстычнай скіраванасці. Каб людзі ведалі свае абавязкі і мелі неабходныя ваенныя навыкі, да падобных вучэнняў прыцягваюцца грамадзяне, прыпісаныя да канкрэтных ваенкаматаў.

## «У аснове павінны ляжаць праўда і факты»

Адказваючы на пытанне, якія змяненні чакаюць інфармацыйнае поле з улікам сучасных выклікаў і пагроз, беларускі лідар падкрэсліў, што ў аснове інфармацыйнай палітыкі павінны быць праўда і факты. «Пры гэтым, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, беларусам важна ўмець за сябе пастаяць. «Калі нешта адбылося, з-за вугла паглядзім, пабаімся, каб не пакрыўдзіць кагосьці», — заўважыў ён. — Гэта добрая якасць, але не для сучаснасці, не для гэтага часу. Калі пачынаюць «мачыць», трэба адказваць».

Кажучы аб інфармацыйнай палітыцы, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў гэтай сферы трэба ўдасканальвацца, пастаянна мадэрнізавацца. ***«Трэба ўставаць і абараняць свой дом,*** — лічыць беларускі лідар, кажучы аб інфармацыйнай вайне. — ***Аднак у гэтай барацьбе ні ў якім выпадку нельга выкарыстоўваць фэйкі: раней ці пазней ісціна будзе высветлена»***. Пры гэтым Прэзідэнт лічыць памылковым меркаванне, што супрацьстаянне ў інфармацыйным полі поўнасцю перайшло ў інтэрнэтпрастору. «Але не выкарыстоўваць яе — глупства: хочам мы таго ці не, але ўся моладзь сядзіць там», — канстатаваў ён, пры гэтым заўважыўшы, што тэлебачанне таксама адыгрывае важную ролю і запатрабавана ў беларускім грамадстве». Пры гэтым, як лічыць беларускі лідар, трэба выкарыстоўваць і новыя каналы сувязі і інфармавання.

## «Мы не павінны ўпусціць момант»

Закраналіся падчас размовы і перспектывы Беларусі ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (на мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка ўдзельнічаў у саміце ШАС, які праходзіў у Самаркандзе). ***«Наступнае пасяджэнне — у Індыі, і мной пастаўлена задача ўсім органам улады і МЗС перш за ўсё, каб мы гэты шлях прайшлі за год*** — раней не збярэцца арганізацыя», — адзначыў Прэзідэнт, кажучы пра ўступленне нашай краіны ў гэтую аўтарытэтную міжнародную супольнасць.

Падчас саміту ШАС Прэзідэнт правёў шэраг сустрэч з многімі кіраўнікамі дзяржаў: гэта і афіцыйныя перагаворы, некаторыя сустрэчы прайшлі кулуарна.

Расказваючы аб сустрэчы лідараў Беларусі і Кітая ў Самаркандзе, Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што былі вырашаны пытанні на мільярды долараў. Па ўсіх узнятых падчас сустрэчы пытаннях былі прыняты станоўчыя рашэнні. Гэта датычыцца і біятэхналогій, і ўзбраення. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што пытанне аб вытворчасці беларускіх рэактыўных сістэм залпавага агню, якія ў далейшым атрымалі назву «Паланэз», упершыню было закранута на такім жа саміце. У далейшым Кітай падтрымаў Беларусь у гэтым пытанні. Цяпер такое ўзбраенне мы робім самастойна.

Чарговы раз Аляксандр Лукашэнка праанансаваў сустрэчу з Сі Цзіньпінам. «Самае галоўнае — у рабочым парадку сесці і паразмаўляць, паглядзець, як выконваюцца даручэнні ў розных сферах: ад сумесных прадпрыемстваў да фінансавых пытанняў», — прыадкрыў некаторыя планы беларускі лідар і прызнаўся, што нават не думаў, што кітайцы на такім высокім узроўні будуць супрацоўнічаць з намі. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што не баіцца «экспансіі» Кітая, бо суверэнітэт Беларусі — паняцце непарушнае.

## «Палякі не дурні»

Згадалі журналісты і папулярнае відэа ў інтэрнэце, на якім Аляксандр Лукашэнка коле дровы для таго, каб не даць Еўропе змерзнуць. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што знята гэта відэа было выпадкова: для Прэзідэнта гэта звычайная справа. Вядома, не ўсе ўспрынялі гэты палітычны жарт.

Што датычыцца наступстваў для звычайных людзей санкцый, хоць пакуль Польшча ў меншай ступені пакутуе з-за санкцыйнага супрацьстаяння Еўрасаюза з Расіяй і Беларуссю, то польскі народ, па словах Прэзідэнта, яшчэ спытае са сваіх кіраўнікоў. Беларускі лідар закрануў іншую тэму: «Адносіны немцаў да палякаў вядомыя. Аднак яны (палякі. — **«Зв.»**) яшчэ больш абвастрылі адносіны — патрабуюць кампенсацыі. Калі ласка, няхай патрабуюць. Можа, і нам яны павінны. ***Аднак устае пытанне: а якую шкоду да 1939 года яны нам прынеслі? Гэта немалыя грошы. Вы як думаеце гэта кампенсаваць? З галавой трэба сябраваць.*** Перш чым ты патрабуеш ад немцаў кампенсацыі, ты падумай, што ты ж таксама камусьці павінен. Гэта такая бязглуздая сітуатыўная палітыка. Гэта можна зразумець у сувязі з тым, што ***яны напярэдадні грандыёзнага шухеру: у іх выбары. І яны гэтую чашу, як мы ў 2020 годзе з іх падачы, вып'юць да дна. Але толькі не з нашай падачы, мы іх не будзем чапаць, але народ з іх спытае, таму і палітыка зменіцца. Гэта чужая польскаму народу палітыка, якую праводзіць цяперашняе кіраўніцтва Польшчы. Палякі не дурні. Гэта людзі, абсалютна падобныя да нас*** — у нас шмат палякаў жыве. Але калі палякі ўвогуле «ачумеюць» і дзесьці вайнушку развяжуць — гэта канец краіне. Аднак, думаю, да гэтага не дойдзе, таму што польскі народ не дазволіць».

## «Трэба помнікі захоўваць, а не скідаць»

Гаворачы аб важнасці патрыятычнага выхавання сярод падрастаючага пакалення, Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што трэба берагчы сваё, прывіваць, пачынаючы з дзіцячага ўзросту, любоў да сваёй краіны і Радзімы. «Сёння мы з вамі тут знаходзімся і гэта робім, — удакладніў беларускі лідар. — Нам што, трэба было ўкладваць немалыя грошы, каб гэта ўсё неяк узняць на больш высокі ўзровень? Але мы ж бачым, што гэта ўсё руйнуецца, і трэба яго прывесці ў парадак. А ў імя чаго? У імя таго, каб мы сваіх дзяцей і ўнукаў сюды прыводзілі, каб яны, ведаючы вось гэтае гістарычнае развіццё нашай краіны, разумелі, колькі за гэта жыццяў паклалі, нявінных людзей колькі загінула. Каб яны гэта шанавалі і бераглі ў сваёй памяці, пераносілі гэта на краіну».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што часткова гэту работу ў свой час упусцілі, думаючы, што ўсё прыйдзе само сабой. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў важнасць правільнай адукацыі дзяцей, пачынаючы з ранняга ўзросту, і нагадаў аб праблемах, узнятых на прыкладзе невялікай прыватнай школы Мінска, аб чым кіраўнік дзяржавы згадваў на нядаўняй сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Савета бяспекі Аляксандрам Вальфовічам. ***«Лепш затраты панесці цяпер на адукацыі гэтых дадатковых (школьнікаў. — «Зв.»), якія недзе па прыватных школах боўтаюцца, чым мы потым будзем іх перавыхоўваць. Таму вось адтуль гэта ўсё ідзе — ад дзіцячага садка, ад школы. І вось на такіх прыкладах трэба паказваць... Колькі тут (у Хатыні. — «Зв.») дзетак загінула! Яны ў чым вінаватыя?! Яны таксама хацелі жыць. А яны згарэлі.*** За што? Таму трэба сваё берагчы, каб ***не быць спаленымі ў гэтых адрынах. Таму трэба гэта захоўваць, а не скідаць помнікі, як гэта робяць ачмурэлыя ў нашых суседзяў».***


Фота БелТА.

## «Я лёсамі людзей не гандлюю»

Падчас размовы журналісты прасілі Прэзідэнта пракаментаваць меркаванні наконт некаторых з'яў, што знаходзяцца ў полі зроку кіраўніка дзяржавы. У прыватнасці, заявы аб тым, што амністыя і памілаванне нібыта з'яўляюцца аб'ектам палітычнага гандлю з Захадам для беларускіх улад. ***«Я не гандлюю людзьмі. Я ніколі так не рабіў і рабіць не збіраюся. Таму ніякага гандлю не будзе. Я не буду таргавацца, нават калі за гэтым будзе нейкая выгада. Я ніколі на гэта не пайду. Але там, дзе можна пайсці на нейкі кампраміс, трэба ісці.*** Гэта ж наша грамадства, яны рана ці позна ўсё роўна выйдуць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што на імя Прэзідэнта пастаянна прыходзяць просьбы аб памілаванні. А амністыя, як вядома, аб'яўляецца да пэўных значных выпадкаў. «Амністыя не значыць, што ўсе выйшлі на волю — камусьці тэрмін зменшым», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, да кожнага выпадку трэба падыходзіць індывідуальна. Але сапраўдным злачынцам дараванне быць не павінна. ***«Той, хто павінен сядзець, — павінен сядзець»***, — канстантаваў ён.

## «Можна і ад нашай зямлі зарабіць і працаваць»

Не страчвае сваёй актуальнасці тэма ўборачнай кампаніі. Актыўная фаза ўжо скончылася, але ў аграрыяў яшчэ хапае працы. Журналісты прэзідэнцкага пула, якія разам з кіраўніком дзяржавы сачылі за ўборкай ураджаю, не пакінулі гэта без увагі. Як не пакінулі і заявы аб пагрозе сусветнага голаду.

«Мы сёлета атрымалі небывалы ўраджай. Ніколі такога не было. Ну вось паварушыліся, і ёсць вынік», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што з пункту гледжання харчавання ў Беларусі ўсё ёсць сваё, асабліва стратэгічныя прадукты: соль, цукар ці хлеб. «Парыцца пра тое, што нехта галадае ў свеце — гэта не пра нас — гатовы падзяліцца. Мы ўсяго, што вырабляем, — палову, ну няхай 60 працэнтаў, з'ядаем, астатняе — на экспарт. У гэтым годзе больш як $8 млрд можам атрымаць толькі ад продажу прадуктаў харчавання. Гэта значыць, можна і ад нашай зямлі зарабіць і прадаць», — рэзюмаваў Прэзідэнт. Таксама, як нагадаў кіраўнік дзяржавы, працягваецца пасяўная кампанія, у якой галоўнае — «каб спаду не было». Таксама важны на сёння момант — максімальна закласці вырашчаную прадукцыю на склады, каб можна было забяспечыць патрэбы гандлю і экспарту ў міжсезонне.

## «Справядлівасць перш за ўсё»

У размове з Прэзідэнтам журналісты не баяліся задаваць і вострыя пытанні. Адно з іх датычылася таго, што людзі, узрушаныя пасля 2020 года, пры адсутнасці адзінага ворага ў выглядзе бчб, кідаюцца адзін на аднаго. У Прэзідэнта спыталі, што з гэтым рабіць, нагадаўшы яго цытату «Закон адзін для ўсіх». Калі не прымаць ніякіх мер — можна прыйсці да «індульгенцыі на беспакаранасць за патрыятызм».

Адказваючы на гэта пытанне, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што да ўсіх, хто працуе побач з ім, у тым ліку і да журналістаў прэзідэнцкага пула, прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні. Гэтыя людзі нясуць асаблівую адказнасць за свае ўчынкі. Па словах Прэзідэнта, акрамя патрабаванняў закона, ёсць вышэйшае паняцце справядлівасці. І вось яно галоўнае. Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што ўсё павінна быць справядліва. «Справядлівасць перш за ўсё. Нельга ніягоднікам дараваць. Але нельга крыўдзіць людзей, нават аблудных», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы параўнаў працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі пасля 2020 года з паслярэвалюцыйнымі падзеямі ці Грамадзянскай вайной пачатку XX стагоддзя, калі «брат брата забіваў». ***«Вось мы нешта падобнае перажылі, толькі без стральбы. У нас хапіла розуму і вытрымкі ў гэтым плане. Цяпер гэты перыяд. Ён павінен прайсці, ён ідзе. Галоўнае — нам гэта давядзецца перажыць. Гэта проста перыяд, дзе нехта на кагосьці будзе валіць, накатваць, кагосьці крыўдзіць, абражаць... Гэта такі перыяд, ён праходзіць»***, — растлумачыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу, што сёння нельга дапусціць расколу ў краіне. Але пры гэтым неабходна адсеяць мярзотнікаў. ***«Тут трэба вельмі акуратна разбірацца. Ні ў якім выпадку не павінна быць дзікага радыкалізму»***, — заявіў кіраўнік дзяржавы.

## «Захад — ён розны»

Адносіны Беларусі і Захаду сёння цяжка назваць сяброўскімі. Журналісты параіліся з Прэзідэнтам, ці варта сёння людзям катэгарычна казаць, што Захад — гэта вораг, асабліва ў рабоце з маладым пакаленнем. Але Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння гэта не варта рабіць.

***«Захад розны. Нешта ёсць і на Захадзе, што мы абавязкова павінны ўзяць.*** Вось немцы нас папракаюць у тым, што «дыктатура» і іншае. Такой дыктатуры, у сэнсе парадку, няма нідзе, як у немцаў. Я памятаю, сорасаўцы задавалі пытанне, што б я ў каго хацеў запазычыць. Я сказаў: у немцаў і ў шведаў. Наколькі я ўяўляў тады: шведская сацыяльная сістэма, клопат аб старых і іншае. А ў немцаў — парадак, жалезны парадак. Там дыктатура яшчэ якая! Гэта цяпер шольцы і іншыя — якія гэта кіраўнікі?.. Жах, што адбываецца ў Германіі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама звярнуў увагу, што разам з тым Захад далёка не такі ідэальны, якім яго ўяўляюць. У прыклад прывёў Англію з яе дэмакратыяй, судамі і знакамітым англійскім правам. «Ніякага там права няма. Хто заплаціць, таму і вырашаць. Гэта права да пары да часу. Арыштуюць твае актывы і забудуцца, што такое права і прыватная ўласнасць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён канстатаваў, што заўсёды трэба глядзець, як лепей для нашай краіны. І не перагінаць, а заўсёды быць акуратнымі.

## «Трэба адсеяць, каб былі нармальныя людзі»

Яшчэ адной тэмай размовы беларускага лідара з журналістамі стала патэнцыйнае вяртанне дадому «збеглых». Некаторыя з іх хочуць вярнуцца, паколькі за мяжой цяжка жыць, але разам з тым баяцца адказнасці, якая будзе чакаць іх у Беларусі. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на ўзроўні Прэзідэнта прыходзіць шмат зваротаў па дадзеным пытанні. І гэтым трэба займацца, гэты працэс трэба прайсці. Па словах Прэзідэнта, нікуды не дзецца ад таго, што прыйдзецца прымаць людзей, якія хочуць вярнуцца. Але іх трэба адсеяць, каб гэта былі нармальныя людзі. «А тыя, хто здзейсніў злачынствы, прасіцца назад не будуць», — падкрэсліў ён. — ***«Хутчэй за ўсё просяцца людзі, якія зразумелі, што на чужыне дрэнна.*** Тут дыктатура, але электрычнасць ёсць і ў душ можна схадзіць. Іх не трэба адпрэчваць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што ён прыхільнік індывідуальнага падыходу.

Напрыканцы Прэзідэнт яшчэ раз звярнуў увагу, што зараз усе перажываюць няпросты перыяд. Але яго варта прайсці, каб потым не было балюча: ***«Трэба быць вельмі акуратнымі і асцярожнымі. Трэба нармальна жыць, каб потым не было сорамна перад дзецьмі».***

**Вераніка КАНЮТА,**
**Валерыя СЦЯЦКО,**
*Лагойскі раён.*

# ТАРЫФЫ ЗАСТАНУЦЦА ДАСТУПНЫМІ

### Пра аплату жыллёва-камунальных паслуг

У краіне цяпер субсідзіруюцца толькі дзве паслугі: цеплазабеспячэнне і падагрэў вады. Гэта самыя важкія па кошце камунальныя паслугі, якія дзяржавай пакрываюцца амаль на 80 %. Пры гэтым паслуга цеплазабеспячэння таксама аплачваецца насельніцтвам па-рознаму. Па эканамічна-абгрунтаваных тарыфах плацяць уласнікі, у кватэрах якіх ніхто не прапісаны, а таксама тыя, хто не заняты ў эканоміцы. Іншыя паслугі ў асноўным аплачваюцца ў поўным аб'ёме, расказаў Андрэй Хмель:

*— Сёння кошт гігакалорыі ў выглядзе тарыфаў для насельніцтва — крыху больш за 20 рублёў, хоць сабекошт у сярэднім па краіне складае каля 100 рублёў.*

### Пра лічбавізацыю і службу «115»

Лічбавізацыя — трэнд, які ў краіне трэба актыўна развіваць і ўдасканальваць, лічыць міністр ЖКГ:

*— Мы рухаемся да дыстанцыйнага здымання паказчыкаў ужытай энергіі, бім-тэхналогій, праграм па кіраванні жылым фондам. Служба «115» знаходзіцца на пачатку свайго шляху і з кожным годам будзе ўдасканальвацца, бо гэта эвалюцыйны працэс, і негатыў, звязаны з яе работай, будзе зніжацца.*

Перад галіной ЖКГ стаіць задача штогод памяншаць колькасць зваротаў насельніцтва са скаргамі і заяўкамі ў службу «115» на 1,5 %, што прадугледжана праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». Аднак сёлета гэтая колькасць зменшылася на 9,2 %, што з'яўляецца вельмі высокім паказчыкам, паведаміў **Віталь СМІРНОЎ, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*— З пачатку года да 31 жніўня ў службу «115» паступіў 1 мільён 650 тысяч заявак, 1 мільён 120 тысяч з якіх — не скаргі, а кансультацыі па пэўных пытаннях: тэматыка іх самая розная. Добраўпарадкаванне тэрыторый, электразабеспячэнне, эксплуатацыя жылля, якасць аказання паслуг па водазабеспячэнні... Зімой гэта, як правіла, ацяпленне, летам — пакос травы, прыборка тэрыторыі. Аднак у большасці сваёй пытанні датычацца ўсё ж эксплуатацыі жыллёвага фонду, бягучага і капітальнага рамонту.*



Паслугі павінны аказвацца людзям якасна і аператыўна. Прычым гэта павінна адбывацца ненавязліва і так, каб іх хацелася спажываць, лічыць **Канстанцін ШУЛЬГАН, міністр сувязі і інфарматызацыі:**

*— Усё, што выкарыстаў чалавек, павінна паступаць у інфармацыйную сістэму пастаўшчыка паслуг без яго ўдзелу, аўтаматычна. Я дадаў бы, што гэтыя налічэнні павінны аўтаматычна спісвацца з рахунку банкаўскай карткі, калі чалавек сам не захоча пракантраляваць, як вядзецца працэс.*

### Пра кіраванне жыллём

У Беларусі існуе дзве асноўныя формы кіравання жыллём: таварыствы ўласнікаў (ТУ) і ўпаўнаважаная асоба — жыллёва-эксплуатацыйныя ўчасткі (ЖЭУ). Стаўленне да людзей, якія жывуць у дамах, знаходзяцца яны пад кіраўніцтвам ТУ ці ЖЭУ, аднолькавае. Што датычыцца кантролю за работай дзяржаўных жыллёвых службаў, то ён сёння больш празрысты, абазначыў Андрэй Хмель:

*— Дзейнасць ТУ так не прасочваецца, аднак існуюць пытанні па дадатковых налічэннях у жыроўках, законнасці прыняцця рашэнняў, правядзенні сходаў. Сёння распрацоўваецца заканадаўчы акт, які зробіць больш жорсткім падыход да дзейнасці ТУ. Каб жыхары былі ўпэўнены, у прыватнасці, што іх грошы ідуць на тыя мэты, на якія яны былі выдаткаваны. Мяркуецца, што да канца года дакумент будзе дапрацаваны.*

### Пра адходы

Дзяржаўная палітыка ў сферы выкарыстання адходаў ставіць мэту да 2025 года забяспечыць выкарыстанне не менш як 64 % ад агульнай колькасці створаных у Беларусі цвёрдых камунальных адходаў, агучыў міністр ЖКГ:

*— У краіне працуе сістэма раздзельнага збору адходаў, нарыхтоўчых пунктаў. Аднак аб'ём другасных матэрыяльных рэсурсаў, якія вымаюцца з цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА), сёння не перавышае 20 %, а ў ЦКА застаецца яшчэ шмат карыснай сыравіны. Таму мы рухаемся ў бок будаўніцтва смеццесартавальных заводаў, каб максімальна выкарыстоўваць карысную сыравіну са створаных аб'ёмаў адходаў. Мы скіраваны на тое, каб выкарыстоўваць тую частку адходаў, што не падлягае другаснай перапрацоўцы, у выглядзе РДФ-паліва, а гэта яшчэ 30 % ад камунальных адходаў, а таксама арганічную частку адходаў — гэта яшчэ 40 %.*

Часам даводзіцца чуць шмат негатыву ў бок ЖКГ, аднак гэта не азначае, што галіна кепска працуе. Проста камунальнікі мала паказваюць свае дасягненні. Насамрэч рэалізоўваецца вельмі шмат праграм і мерапрыемстваў, каб грамадзянам жылося лепш. А яшчэ вельмі важна чуць ад насельніцтва аб'ектыўную крытыку — гэта дапамагае галіне рухацца наперад, рэзюмаваў міністр.

Спецыялісты спадзяюцца, што ўсе пачутыя і ўбачаныя на выставе прапановы з часам будуць укараняцца.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Каштоўнасці

### Мітрапаліт ВЕНІЯМІН:

# «СЯМЕЙНАЕ ЖЫЦЦЁ — АДЗІН СА ШЛЯХОЎ ДА БОГА»

### У Мінску прайшоў «Славянскі форум сем'яў»

**Яго пляцоўкай была абрана Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Форум сабраў шматдзетныя сем'і і моладзь, прадстаўнікоў міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, інфармацыі, аховы здароўя і адукацыі, духавенства, парламентарыяў, грамадскіх аб'яднанняў. Мерапрыемства заклікана аб'яднаць намаганні дзяржавы, царквы і грамадства ў захаванні і ўмацаванні традыцыйных духоўна-маральных сямейных каштоўнасцяў, арыентаваных на моцную сям'ю, пераемнасць пакаленняў, здаровы лад жыцця.**

У рабоце форуму таксама ўзялі ўдзел прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі ад органаў дзяржаўнага кіравання ў сферах сямейнай палітыкі, аховы здароўя, адукацыі, інфармацыі, парламентарыяў, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, навуковай супольнасці, праваслаўнай царквы.



Фота БелТА.

Як падкрэсліў, адкрываючы мерапрыемства, **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі,** слова Божае вучыць, што сям'я з'яўляецца натуральным пачаткам жыцця. Менавіта ў сям'і людзі злучаюцца, каб навучыцца дасканалай любові, узаемаразуменню, сумесна ісці па жыцці ў пошуку шляху збаўлення.

— Сямейнае жыццё разглядаецца як адзін са шляхоў да Бога, — падкрэсліў уладыка. — Менавіта любоў адзін да аднаго, выхаванне ў любові і праз любоў ёсць аснова хрысціянскай сям'і, дзе вырастаюць традыцыі і культура і ў канчатковым выніку фарміруецца народ. Ва ўсе часы сям'я з'яўлялася адной з найважнейшых апор дзяржавы, захавальніцай яе асноў, асновай пераемнасці пакаленняў і стабільнасці грамадства, — адзначыў мітрапаліт.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** падрабязна спынілася на пытаннях дзяржаўнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі.

— Быць бацькамі — вельмі адказная місія. Таму дзяржава дае сем'ям з дзецьмі падтрымку ў розных сферах. Гэта працоўныя, падатковыя і пенсіённыя гарантыі, дапамогі і сямейны капітал, адрасная дапамога і сацыяльнае абслугоўванне, падтрымка ў сферы адукацыі, аховы здароўя, жыллёва-крэдытных адносін. Толькі летась выдаткі на ўсе гэтыя мэты склалі больш за 5 мільярдаў рублёў, — адзначыла міністр.

Безумоўна, гарантыі і льготы для сем'яў з дзецьмі вельмі важныя, але не менш важным з'яўляецца ўмацаванне інстытута сям'і і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.

— Будучыня ёсць у той краіны, дзе нараджаюцца дзеці. Таму вельмі важнай з'яўляецца папраўка аб тым, што сем'ям з дзецьмі аказваецца падтрымка на дзяржаўным узроўні. Дзеці — самае дарагое, што ў нас ёсць, таму гарантыя іх шчаслівага «заўтра» — ключавы кірунак нашай палітыкі, — рэзюмавала Ірына Касцевіч.

Арганізатарамі форуму выступілі Беларуская праваслаўная царква, Дабрачынны фонд падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства "Пакроў" пры падтрымцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Эканоміка Вялікабрытаніі ўступіла ў рэцэсію

Гэта адзначаецца ў справаздачы Банка Англіі, паведаміла ТАСС.



У дакуменце паведамляецца, што валавы ўнутраны прадукт Вялікабрытаніі зніжаецца два кварталы запар. У другім квартале ВУП знізіўся на 0,1 працэнта. Канчатковых даных па трэцім квартале пакуль няма, аднак Банк Англіі прагназуе зніжэнне ВУП па яго выніках таксама на 0,1 %. Як вядома, аб надыходзе рэцэсіі ў эканоміцы кажуць, калі рэальны валавы ўнутраны прадукт зніжаецца на працягу двух кварталаў запар. 22 верасня Банк Англіі паведаміў аб павелічэнні базавай працэнтнай стаўкі з 1,75 да 2,25 працэнта. Узровень інфляцыі ў кастрычніку прагназуецца на рэкордная адзнацы ў 11 працэнтаў.

### Германія ўпершыню ў гісторыі апынулася на мяжы дэіндустрыялізацыі



Краіна на фоне энергетычнага крызісу ўпершыню ў сваёй гісторыі сутыкнулася з такой з'явай, як дэіндустрыялізацыя — маштабнае зніжэнне прамысловай вытворчасці. Пра гэта паведаміла нямецкае выданне FOCUS online. Паводле афіцыйных звестак, цэны вытворцаў у Германіі ў мінулым месяцы падняліся на 45,8 працэнта. Такога не адбывалася з 1949 года, калі ў краіне пачалі весці статыстычныя назіранні. Прычынай спаду прамвытворчасці ў Германіі стала рэзкае павышэнне кошту энерганосьбітаў, які ўзрос на 139 працэнтаў. У найбольш цяжкім становішчы апынуліся нямецкія вытворцы, якія не могуць перавесці свае магутнасці ў іншыя краіны з больш спрыяльнымі ўмовамі. FOCUS online адзначае, што такое становішча пагражае тым, што могуць зніknуць цэлыя галіны эканомікі. І Германія ў перспектыве ператворыцца ў аграрную краіну.

### У Аўстраліі на бераг выкінуліся 230 кітоў



На заходнім узбярэжжы вострава Тасманія знойдзены 230 кітоў, якія па невядомых прычынах выкінуліся на бераг, паведаміла радыё SBS World News. Дырэктар па аперацыях службы аховы дзікай прыроды штата Брэндон Кларк пацвердзіў, што 35 з 230 аказаліся жывыя. «Прынамсі 35 млекакормячых жывыя і знаходзяцца на пляжы, асноўная ўвага будзе ўдзелена іх выратаванню», — сказаў ён. Пакуль складана вызначыць, чаму кіты апынуліся на пляжы. Як паведамляе радыё, кіты выкінуліся на бераг паблізу гавані Макуоры, дзе ў 2020 годзе адбыўся іншы маштабны выкід млекакормячых. На прыбярэжнай зоне былі знойдзены каля 500 чорных дэльфінаў, 300 з іх загінулі.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Вячаславу Віктаравічу Дурнову, намесніку старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## Уладзімір ДРАЖЫН:

# «Жыццё — надзвычай цікавая рэч»

**У найбліжэйшую нядзелю, 25 верасня, прыгожую дату — 75 гадоў — адзначыць вядомы дзяржаўны дзеяч Беларусі Уладзімір Дражын. Цікава, што яго добра ведаюць дзеячы культуры, для сферы якой ён шмат зрабіў і на пасадзе віцэ-прэм'ера, і ў якасці Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Літве і Фінляндыі. Разам з тым пра заслугі Уладзіміра Дражына памятаюць на Міншчыне, у Нясвіжы, Жодзіне, дзе ён названы ганаровым грамадзянінам, на Старадарожчыне, дзе яго імя занесена ў Кнігу народнай славы... Кавалер ордэна Пашаны, уладальнік шматлікіх узнагарод і пачэсных званняў, ён перш за ўсё чалавек цікавы і неардынарны, пра што сведчаць напісаныя ім кнігі: пра малую радзіму, пра краіны, у якіх працаваў, пра гольф, развіццём якога займаецца апошнія гады... Жыццёвы вопыт Уладзіміра Дражына настолькі багаты, што ў адной гутарцы ахапіць яго немагчыма. Мы спыніліся толькі на некаторых знакавых момантах...**



### «Праца талакой вучыла разбірацца ў людзях»

***— Уладзімір Несцеравіч, вашаму асабістаму юбілею заўсёды папярэднічае юбілей шлюбу, і мне падаецца, гэта не менш важна. Сёлета вы адзначылі 50 гадоў сумеснага жыцця з жонкай Тамарай. Ад душы віншую і прашу падзяліцца сакрэтам сямейнага даўгалецця.***

— Думаю, сакрэт хаваецца ў часе, які фарміраваў нас як асоб. Наша дзяцінства прыпала на аднаўленне краіны пасля вайны. Станаўленне адбывалася разам з гэтым працэсам. Пішу пра гэта ў сваёй кнізе (Уладзімір Дражын: «Мая вялікая малая Радзіма...» — **«Зв.»**), бо дзіцячая памяць учэпістая, і я памятаю сябе вельмі рана. Як у разбуранай ушчэнт вёсцы будавалі школу, бальніцу, аптэку, клуб, аднаўлялі жыллё... Кожны двор меў абавязак адпрацаваць 10 дзён на вывазцы гравію з мясцовага кар'ера для будаўніцтва дарогі. Галоўная задача была — выжыць, але не па прынцыпе кожны сам за сябе, а ўзаемнай дапамогі. Усе жыхары клапаціліся аб тым, каб забяспечыць сем'і загінулых воінаў Чырвонай Арміі сродкамі існавання: сенам, саломай, дровамі... Праца талакой вучыла зносінам, а таксама разбірацца ў людзях, звяртаць увагу не толькі на знешнюю прыгажосць, але і на маральныя якасці.

Нас з ранняга дзяцінства прывучылі да працы. Разам з тым мы разумелі важнасць адукацыі. А гэта ўжо выхаванне адказнасці.

Няўдачы нас загартоўвалі. І гэта яшчэ адна рыса майго пакалення. Тады ўсе імкнуліся атрымаць сярэднюю або вышэйшую адукацыю, бо краіне патрэбны былі кваліфікаваныя кадры. З-за «чацвёркі» па няпрофільным прадмеце мне не хапіла аднаго бала для паступлення на аўтатрактарны факультэт у політэхнічны інстытут. Тады дырэктар нашай школы паручылася за мяне ў раёне, і мне прапанавалі работу настаўніка фізікі і матэматыкі.

Наступным летам зноў планаваў паступіць у ВНУ, але мяне прызвалі ў армію. Служыў тры гады ў Беларускай ваеннай акрузе.

Пасля арміі ажыццявіў сваю мару — паступіў на вячэрні факультэт аўтатрактарнага факультэта. Тады і заўважыў Тамару — сваю будучую жонку. Праз два гады мы ажаніліся. Выбар спадарожніка жыцця — справа вельмі далікатная. Бо доўга ісці разам атрымаецца толькі з тым, хто згодны з табой у галоўным, хто падтрымлівае там, дзе шлях становіцца пакручасты. Важная ўмова паспяховай сям'і — яднанне. Можна спрачацца, мець розныя погляды на пэўныя рэчы, але пры гэтым два чалавекі мусяць складаць адно цэлае. І я вельмі ўдзячны лёсу, што менавіта такая жанчына мне сустрэлася.

Тамара падтрымала, калі падчас маёй работы на Беларускім аўтамабільным заводзе атрымаў прапанову паступіць у Мінскую вышэйшую партыйную школу. А гэта азначала страту заробку. ...І калі пасля заканчэння вучобы мне прапанавалі ўзначаліць Нясвіжскі райкам партыі. А на той час мы мелі кватэру ў Жодзіне, толькі нарадзілася дачка, сын павінен быў ісці ў першы клас. Што такое кіраўнік раёна? Гэта пераезд, праца з раніцы да вечара, у выхадныя. І пры гэтым я заўсёды быў спакойны за сям'ю, дзяцей і дом.

І тады, і потым, калі працаваў у аблвыканкаме, ва ўрадзе, у парламенце, пасольстве, Тамара ішла побач і пры гэтым не забягала наперад і не цягнула назад. За дзень ёй прыходзілася быць са мной на трох афіцыйных прыёмах, у рознай форме адзення, і яна ніколі не прымусіла мяне хвалявацца.

У нас выраслі цудоўныя дзеці. І ў гэтым вялікая яе заслуга. Маё сямейная жыццё сапраўды склалася.

### «Шчаслівы, што культура заняла першае месца ў маім жыцці»

***— Раскажыце, як атрымалася, што вы, тэхнар па адукацыі, так шмат увагі аддавалі культуры?***

— Думаю, гэта таксама сфарміравалася ў дзяцінстве — імкненне да прыгожага, да гармоніі ва ўсім. Калі ў жніўні 1981 года ўбачыў палац Радзівілаў, адначасова захапіўся яго прыгажосцю і жахнуўся яго занядбанасцю. З першых сваіх прамоў у якасці кіраўніка рэгіёна казаў пра неабходнасць аднаўлення гэтай жамчужыны Беларусі. Але каб ад слоў перайсці да справы, патрэбна было рэспубліканскае фінансаванне.

У 1990 годзе адраджэнне Нясвіжа ўключыў у перадвыбарную праграму. Ужо дэпутатам Вярхоўнага Савета сустрэўся з кіраўніком урада Вячаславам Кебічам і прапанаваў надаць палацу статус нацыянальнага музея з адпаведным фінансаваннем. Той пагадзіўся не адразу, тым не менш, дакумент падпісаў, санаторый у сценах палаца закрылі, і гэта выклікала незадаволенасць мясцовых жыхароў. Пераконваў людзей, што ідэя добрая.

У верасні 1994 года Аляксандр Лукашэнка, толькі абраны Прэзідэнтам Беларусі, наведаў Нясвіж, і мы чатыры гадзіны хадзілі з ім па палацы. У краіне грошай лішніх не было. Тым не менш рэстаўрацыя стартавала. Актыўныя работы пачаліся ў канцы 90-х. Тады я ўжо працаваў у аблвыканкаме і займаўся Нясвіжам на больш высокім узроўні. У 2001 годзе прыйшоў ва ўрад — гэта час маштабнай работы па аднаўленні палаца. Інвестыцыі ў комплекс склалі 75 мільёнаў долараў.

«Музы Нясвіжа» сталі не проста годным напаўненнем палаца, а падзеяй у культурным жыцці Беларусі. Мясцовае насельніцтва палюбіла гэтае свята, бо выхаванае ў духу высокай культуры. І фестываль, і палац, і паркі сталі нагодай для гонару ўсіх беларусаў.

Нясвіжскі палац, Мірскі замак, Вялікі тэатр Беларусі, Беларуская дзяржаўная філармонія, Беларускі дзяржаўны цырк, Нацыянальны тэатр імя Янкі Купалы — аднаўленне гэтых аб'ектаў закладвалася падчас маёй работы на адпаведных ступенях дзяржаўнай службы, і я рады, што такім чынам далучыўся да развіцця нацыянальнай культуры. Гэта было няпроста, бо вырашыў браць на сябе нагрузку і адказнасць. Але ўпэўнены, што краіна без культуры не мае перспектывы.

Калі прыйшоў на працу паслом Беларусі ў Літве і Фінляндыі і паглядзеў на магчымасці, якія маем у двухбаковых адносінах, — наперадзе ішла культура. Тады пачаў маштабна праводзіць Дні культуры Беларусі ў гэтых краінах. Яны доўжыліся па два месяцы. Выязджалі да 20 творчых калектываў, да тысячы артыстаў. Вялікі тэатр оперы і балета, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, Народны хор імя Цітовіча, тэатр імя Янкі Купалы, тэатр імя Горкага, Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца, ансамбль «Харошкі», «Купалінка»... Грошы выдаткоўвалі літоўскія і фінскія бізнесмены, якія зацікаўлены ў партнёрстве з Беларуссю. У 2013 годзе мы паказалі балет «Лебядзінае возера» на воднай гладзі каля сцен Тракайскага замка. Яго паглядзелі пяць тысяч чалавек.

Культурныя стасункі рыхтавалі глебу для наладжвання эканамічных, а за імі і палітычных кантактаў. На ўсе мерапрыемствы мы запрашалі кіраўніцтва краіны. Пасля знаёмства з беларускімі спектаклямі тагачасны прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубілюс вырашыў праехаць па Беларусі разам з вядомымі літоўскімі палітыкамі і міністрамі (усяго 50 чалавек) на веласіпедах.

Зрэшты, усё гэта мела эканамічны эфект. За час маёй місіі тавараабарот з Літвой вырас у тры з паловай раза, з Фінляндыяй — у 10 разоў. Культура — галоўны складнік поспеху любога кіраўніка. Яна павінна быць ва ўсім: у паводзінах, адносінах з людзьмі, маўленні, знешнім выглядзе... Культура дапамагае вырашыць праблемы. Нездарма нават у ваенны час пра яе быў асаблівы клопат. Яна натхняе, яднае, умацоўвае, падымае дух. І народ заўсёды цэніць таленавітых людзей. Я шчаслівы з-за таго, што культура заняла першае месца ў маім жыцці.

Дарэчы, як старшыня Беларускай асацыяцыі гольфа прапанаваў уключыць у культурную праграму інвестыцыйнага турніру, які нядаўна завяршыўся, наведванне тэатра. Удзельнікі турніру ўжо палюбілі наш Вялікі тэатр, гэтым разам мы паглядзелі «Ганну Карэніну».

### «Не сумняваюся, што ўсё наладзіцца»

***— Некалькі гадоў таму выйшла ваша кніга «Беларусь — Литва: время сближения». Як думаеце, час набліжэння паміж двума краінамі-суседкамі вернецца?***

— Несумненна. Я штодня атрымліваю адтуль шмат званкоў, у мяне там засталося нямала сяброў. Яны дапамагалі сустрэць, размясціць, накарміць, заплаціць ганарары і камандзіровачныя беларускім артыстам. Гэта рабілі літоўскія кампаніі. Яны былі зацікаўленыя, бо мелі перспектыву дынамічнага развіцця бізнесу ў Беларусі. Беларускія грузы, якія накіроўваліся ў Клайпеду, пакідалі ў літоўскай казне мільярд долараў. Гэта толькі гандаль. Пакуль я ўзначальваў дыпламатычнае прадстаўніцтва, у Літве было пабудавана восем беларускіх заводаў — а гэта ўжо інвестыцыі.

«Паўлінка» Купалы ўпершыню была пастаўлена ў Вільнюсе сто гадоў таму, а дзяржаўнай мовай Вялікага Княства Літоўскага была беларуская... Мы можам спрачацца, але можам і знаходзіць узаемапаразуменне — было б жаданне. А жаданне мець выхад на ўсход у літоўскага бізнесу ёсць, бо гэта перспектыўна. 95 працэнтаў насельніцтва Літвы таксама гэтага жадае. Нармальныя адносіны з суседзямі заўсёды былі і будуць умовай далейшага развіцця для любой краіны. Таму не сумняваюся, што ўсё наладзіцца. Супраць беларуска-літоўскага набліжэння толькі некаторыя літоўскія палітыкі, якія працуюць не ў інтарэсах свайго народа. І лёс іх сумны. Літоўцы не будуць цярпець галечы, а ў іх ужо зараз сіл нестае мірыцца з камунальнымі плацяжамі. І тое, што там цяпер адбываецца, пацвярджае, што Літва зноў павернецца да Беларусі. ...Калі пазбегне экспансіі Польшчы.

Нам таксама важна не апынуцца паміж молатам і кавадлам. Пакуль гэта атрымліваецца, бо наш Прэзідэнт вядзе незалежную палітыку, а я не сумняваюся, што ён будзе яе працягваць.

***— Раскажыце, што Беларуская асацыяцыі гольфа ўдалося зрабіць для развіцця гэтага віду спорту ў нашай краіне?***

— Мы пачыналі з нуля. Зараз у Беларусі маюцца два полі для гульні ў гольф: чэмпіёнскае (на 18 лунак) і акадэмічнае (на 9 лунак). Наша класічнае поле створана на былым танкадроме, а гэта значыць, мае ландшафт, які патрабуецца для гольфа. Аўтар праекта англійскі архітэктар Пол Томас, і ўсе, хто да нас прыязджае, кажуць, што гэта найлепшае поле ў Еўропе. У нас сфарміравалася каманда трэнераў, абслугоўвы персанал, і мы маем усе магчымасці прымаць спартсменаў па найвышэйшым разрадзе. Летась гульцамі на чэмпіёнскім полі і гасцямі пабывалі тры тысячы чалавек. Гэта ўжо вынік. Такім чынам, мы стварылі індустрыю. Цяпер любы чалавек у нашай краіне можа ўзяць напракат рыштунак, наняць трэнера і навучыцца гульні ў гольф.

Наша задача — адкрыць палі для гольфа ва ўсіх рэгіёнах. Вяду перамовы пра гэта з кіраўнікамі абласцей. Але ў нас ёсць другая дысцыпліна — міні-гольф. Гэта гульня для школьнікаў, навучэнцаў каледжаў і студэнтаў. Разам з Прэзідэнцкім спартыўным клубам мы аснасцілі 25 навучальных устаноў Беларусі ва ўсіх рэгіёнах камплектамі для ігры ў міні-гольф: у спартзалах, на пляцоўках каля школ. Гэта дысцыпліна таксама прывабная. Падчас фестывалю «Вытокі» пляцоўкі з міні-гольфам наведваюць па 2-3 тысячы чалавек за дзень.

Гольф дазваляе захоўваць добрую фігуру, ён і нараджае спартыўны інтарэс, і развівае інтэлект, і дорыць асалоду ад зносін з прыродай. Кожнаму варта паспрабаваць! Мае ўнукі займаюцца, старэйшы ўдзельнічае ў турнірах.

### «Кіраўнікі павінны бачыць далей за справаздачы»

***— У вашай кнізе «Дражно. Моя малая Родина» шмат цікавай гістарычнай інфармацыі, любові да людзей і... болю за малыя вёскі. Што, на ваш погляд, можа іх выратаваць?***

— На пачатак мінулага стагоддзя ў Дражне пражывала 930 чалавек. Цяпер — менш за 100. Ды што Дражна — Нясвіжчына за апошнія 20 гадоў страціла каля 14 тысяч чалавек, а гэта ж блаславёны край — там, у адрозненні ад Старадарожчыны, дзе знаходзіцца мая родная вёска, урадлівыя глебы.

Жыццё населенага пункта залежыць ад наяўнасці ў ім працоўных месцаў. І не толькі. Калі закрываецца неэфектыўнае прадпрыемства, кіраўніцтва рэгіёна абавязана паклапаціцца пра адкрыццё іншага, больш паспяховага. Трэба ствараць умовы для развіцця малога бізнесу, з'яўлення новай вытворчасці, забеспячэння сыравінай існуючай. Кіраўнікі павінны бачыць далей за лічбы ў справаздачах. Паўтару: нельга забываць пра культурны складнік. Без гэтага няма будучыні. Важная ўмова — умець чуць людзей і разам з тым пераконваць уласнае начальства. Калі я ўзначальваў Нясвіжскі раён, то шмат пытанняў вырашаў у Мінску. Не заўсёды і не ўсе мяне хацелі слухаць, але прыходзілася быць настойлівым.

Перажываю за сваю вёску. Дабіваюся яе газіфікацыі, размаўляю з аблвыканкамам, каб не закрывалі мясцовую аптэку — у яе прыходзяць жыхары пяці суседніх населеных пунктаў! А калі закрыюць аптэку, ім прыйдзецца ездзіць за 20 і больш кіламетраў у райцэнтр. Старадарожчына — край не багаты, але самадастатковы, там жывуць працаздольныя людзі.

Анатоль Іванавіч Марукович быў ва Уладзіміра Мікалаевіча прарэктарам па гаспадарчай рабоце. А неўтаймаваны Шымаў беспярэпынна нешта будаваў, рамантаваў, абнаўляў, мадэрнізаваў. Толю ад рэктара даставалася! Але ён не маркоціўся. Худы, рухавы, з агеньчыкам у вачах — ён паўсюль паспяваў. Па некаторых гаспадарчых пытаннях я кансультаваўся не толькі з Шымавым, але і з Маруковічам. Гаварыў Толя заўсёды каротка і па сутнасці. Шкада, што не магу перанесці на паперу яго сакавітыя анекдоты, ды і немагчыма расказаць іх лепей, чым ён.

Ва Уладзіміра Мікалаевіча ва ўніверсітэце быў аб'ектыўны, прафесійны і ў той самы час любяшчы цэнзар-кантралёр — яго жонка Вольга Сяргееўна. Пажаніліся яны яшчэ студэнтамі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Вольга Сяргееўна па жыцці ад мужа не адставала, абараніла і кандыдацкую, і доктарскую дысертацыі, ва ўніверсітэце загадвала кафедрай эканомікі прыродакарыстання, набыла вядомасць як аўтар арыгінальных вучэбных дапаможнікаў, як аўтарытэтны і прадукцыйны вучоны-эканаміст. Прынцыповая, адказная, яна, безумоўна, дапамагала свайму мужу ў службовым і навуковым росце, але сама заставалася ў яго за спінай. Мы з Таццянай з Шымавымі пасябравалі. Аб'ядноўвала нас яшчэ і любоў да класічнай музыкі. Мы часта разам бывалі ў оперы ці хадзілі на канцэрты нашага блізкага сябра — маэстра Аляксандра Міхайлавіча Анісімава.

Студэнты свайго рэктара ведалі і паважалі. Мы з Уладзімірам Мікалаевічам рэгулярна сустракаліся са студэнцкім актывам. І не толькі яго ўніверсітэта. Як міністр адукацыі, я практыкаваў адзін раз у семестр сустрэчу са студэнцкім актывам усіх ВНУ краіны. Па 3—7 чалавек ад кожнай навучальнай установы. Расказваў, над чым працуе міністэрства, якія пры гэтым узнікаюць складанасці, адказваў на пытанні студэнтаў. Такія сустрэчы мы рыхтавалі са старшынёю Савета рэктараў і разам іх праводзілі.

Да кожнага са сваіх студэнтаў Шымаў стараўся быць гранічна ўважлівы. І да іх вучобы, і да паводзін, да зацікаўленняў у жыцці. Казаў, што ад дрэнных звычак маладых людзей можна адвесці, толькі нагрузіўшы іх карыснымі і прывабнымі справамі — вучобай, навукай, спортам, творчасцю.

Уладзімір Мікалаевіч ва ўсіх справах быў са мною побач. У міністэрстве, у Акадэміі навук, у Адміністрацыі Прэзідэнта. Гэта разумны, прынцыповы, але добразычлівы паплечнік і сябра. Рэктар!

Калі мяне выбралі старшынёю «Белай Русі», Шымаў сабраў свой актыў і прапанаваў стварыць ва ўніверсітэце пярвічную арганізацыю гэтай грамадскай арганізацыі. На пытанне аднаго з калег «Навошта гэта трэба?» адразу адказаў:

— Наш міністр узначаліў гэта грамадскае аб'яднанне, таму і мы павінны ў яго ўвайсці.

Уладзімір Мікалаевіч уголас заявіў, што пры дасягненні 70-гадовага ўзросту сыдзе з пасады рэктара. Мне пры гэтым казаў, што лепей сысці на два гады раней, чым на пяць хвілін пазней. Яго прасілі застацца. Не, сышоў і з пасады рэктара, і з пасады старшыні Савета рэктараў. Але і цяпер ён са мною!

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня, 13, 20, 27 жніўня, 3, 17 верасня.)*

*(Працяг будзе 1 кастрычніка.)*

# РАТАВАЛІ ЛЮДЗЕЙ І КНІГІ

## Магілёўская абласная бібліятэка падняла архівы пра сваіх гераічных супрацоўнікаў

**На пачатак вайны штат абласной бібліятэкі налічваў 13 чалавек, двое з якіх былі прызваныя ў рады Чырвонай Арміі, расказвае вядучы бібліятэкар Аліна Ніедра. Установа не была эвакуіравана і стала месцам сустрэч падпольшчыкаў. Чытачам была даступная толькі частка мастацкай літаратуры. Фонд знаходзіўся пад асаблівым наглядам немца са штаба Розенберга.**

З 1 чэрвеня 1940 года дырэктарам бібліятэкі стала Марына Нянашава, якая працавала тут з дня заснавання — 5 студзеня 1935 года. Былы кіраўнік падпольнай групы «Камітэта садзейнічання Чырвонай Арміі» Надзея Арлова ў сваіх успамінах пісала, што Марына Міхайлаўна была звязана з падпольнай групай, якая дзейнічала ў раёне трубаліцейнага завода. У бібліятэцы яна хавала тых, хто ўцёк з лагера ваеннапалонных, уладкоўвала іх на работу, адпраўляла ў партызанскі атрад. З яе дазволу ў чытальнай зале і кнігасховішчы ладзіліся сустрэчы падпольшчыкаў. Для перадачы інфармацыі партызанам бібліятэкары на старонках кніг упісвалі алоўкам прозвішчы і іншыя звесткі. Як сведчаць даныя Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, за сувязь з партызанамі Марына Нянашава расстраляна немцамі ў 1943 годзе.

Жыццём рызыкавала яшчэ адна супрацоўніца бібліятэкі — Ганна Чудовіч, якая на пачатку вайны працавала загадчыцай абанемента. Разам з Марынай Міхайлаўнай яна ратавала каштоўную літаратуру, якую немцы спрабавалі вывезці ў Германію.

Яны закопвалі кнігі ў зямлю, хавалі ў скляпах, на гарышчах, у комінах, раздавалі супрацоўнікам і надзейным чытачам. У 1946-м абласная газета «За Радзіму» пісала, як прыбіральшчыца бібліятэкі Фядора Скрыпчанка замуравала ў галандскай печы 342 кнігі, а пасля вызвалення Магілёва вярнула іх у бібліятэку. Дзякуючы выратавальнай «аперацыі» ў бібліятэку было вернута каля 40 тысяч экзэмпляраў каштоўных выданняў.

Пасля расстрэлу Марыны Нянашавай Ганна Якаўлеўна ўзначаліла бібліятэку і заставалася на пасадзе дырэктара да 1946 года. Увесь перыяд Вялікай Айчыннай вайны Ганна Якаўлеўна падтрымлівала сувязь з 113-м Чырвонапартызанскім палком. Дапамагала распаўсюджваць улёткі, перадавала партызанам паперу, канцылярскія прылады і ваенную літаратуру. На старонках пасляваеннай газеты «За Радзіму» публікаваліся водгукі байцоў, дзе яны дзякавалі Ганне Якаўлеўне за кнігі. Дарэчы, менавіта дзякуючы Ганне Якаўлеўне падпольшчыкі змаглі самастойна зрабіць гектограф для размнажэння ўлётак. Надзея Арлова пісала ў сваіх успамінах, як Ганна Якаўлеўна дазволіла ёй прабрацца ў забаронены фонд бібліятэкі і вырваць з Вялікай савецкай энцыклапедыі старонку з апісаннем гэтага прыбора.

Чытальная зала бібліятэкі пачала працаваць ужо на пяты дзень пасля вызвалення Магілёва. Работнікі самастойна зашклілі вокны, з падручных матэрыялаў змайстравалі стэлажы для кніг. За актыўны ўдзел у рабоце па аднаўленні горада Ганна Чудовіч была ўзнагароджана медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Пасля вайны ў абласной бібліятэцы працавала шмат франтавікоў. Сярод іх удзельнік вайны з Фінляндыяй і Вялікай Айчыннай вайны Іван Антонавіч Пруднікаў, які за свае баявыя подзвігі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і пяццю медалямі. У бібліятэцы ён прайшоў шлях ад памочніка бібліятэкара да загадчыка аддзела міжбібліятэчнага абанемента. І выконваў свае абавязкі з не меншай адказнасцю. За свае дзелавыя якасці і актыўную грамадзянскую пазіцыю ўзнагароджваўся граматамі абласнога ўпраўлення і Міністэрства культуры БССР.

Старшы бібліятэкар Іван Загорскі ў гады Вялікай Айчыннай з'яўляўся членам Камітэта садзейнічання Чырвонай Арміі і распаўсюджваў антыфашысцкую літаратуру, збіраў разведвальныя звесткі аб варожых аб'ектах, медыкаменты для партызанскіх атрадаў. Бібліятэкар Агаф'я Цэбрава ў гады вайны была сувязной 128-га і 129-га атрадаў 14-й партызанскай брыгады. У бібліятэцы яна таксама некалькі гадоў узначальвала пярвічку таварыства Чырвонага Крыжа. На розных пасадах працавала тут і адважная франтавічка Лідзія Шушкевіч (Батурына), подзвігі якой былі адзначаны медалямі «За абарону Сталінграда», «За баявыя заслугі», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Яна таксама ўзначальвала партыйную арганізацыю бібліятэкі.

Асаблівы гонар сённяшніх супрацоўнікі бібліятэкі адчуваюць за Ганну Бабушкіну, ураджэнку Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. На пачатку вайны яна з мужам жыла ў Брэсце і, калі ў жніўні 1941 года там быў створаны антыфашысцкі камітэт, была яго актыўнай удзельніцай. Працавала спачатку інструктарам, потым намеснікам старшыні. Разам з таварышамі збірала і перадавала зброю партызанам, праводзіла дыверсіі на прадпрыемствах, выконвала шмат іншых не менш важных баявых задач. У яе кватэры было ўстаноўлена прыстасаванне для прыёму зводак Саўінфармбюро і далейшай перадачы іх падпольшчыкам. Адважная падпольшчыца ваявала таксама ў складзе брыгады партызанскага атрада «1 Мая», а ў 1944 годзе працавала сакратаром Баранавіцкага падпольнага гаркама камсамола і ўдзельнічала ў дыверсіях. За заслугі перад Айчынай Ганна Бабушкіна ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» І ступені, «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» узнагароджаны і іншыя работнікі абласной бібліятэкі, сярод якіх Ганна Вашчанка, Соф'я Каінава, Хая Чарток.

**Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 73 (599)

Вячаслаў НІКІФАРАЎ:

# «Неадназначнасць створанага вобраза — прыкмета таленту»

**МІЛЬЁНЫ людзей адчулі на сабе магію яговых фільмаў... «Зімародак», «Бацькі і дзеці», «Душа мая, Марыя», «Фруза»... Зрэшты, паглядзець іх можна было апошнім часам у Музеі гісторыі кінамастацтва, дзе падрыхтавалі рэтраспектыву да 80-годдзя рэжысёра Вячаслава Нікіфарава. Майстар і сёння жыве ўлюбёнай справай... Падчас нашай размовы раптам замаўкае, пільна ўглядаючыся некуды праз акно кавярні, потым тлумачыць:**

**— Звычка прафесійная... Падбіраю ўвесь час акцёраў... Вунь дзяўчынка пайшла. Якраз бы ў фільм «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», які я даўно мару зняць...**

**Пра фільмы знятыя і нязнятыя, пра настаўнікаў і вучняў у чароўным свеце кіно, пра тое, як паказаць на экране нацыянальны характар і як знайсці ключ да ролі, для чытачоў «Звязды», распавядае заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР рэжысёр Вячаслаў НІКІФАРАЎ.**

***— Я чытала, што вы вучыліся ва Улан-Удэ ў вучня Меерхольда...***

— Тут трэба патлумачыць, чаму мы пакінулі Кубань, дзе я нарадзіўся. Пасля вайны праводзілі расследаванне злачынстваў нямецка-фашысцкіх акупантаў і іх прыслужнікаў. Тата быў рэдактарам раённай газеты і непасрэдным удзельнікам гэтых расследаванняў. Помню ў нашым доме паўсюль стосы пакарабачаных фотаздымкаў з выявамі павешаных людзей, раскапаных пахаванняў... Быў 1957 год. Прайшло дзесяць гадоў стандартнага тэрміну пакарання для многіх паліцаяў. І ўсё часцей у нашай паштовай скрыні пачалі сустракацца лісты з пагрозамі. Тыя, хто вярталіся са зняволення, іх сваякі пагражалі бацьку. А мы жылі на ўскраіне, месца глухое... За гародамі — лес... Таму мама вельмі была ўстрывожаная. Бацька ж камуніст, стаўленне да працы — самі разумееце: матаўся па раёне дзень і ноч, цэлымі суткамі. Мама вельмі баялася. Спехам прадалі дом — і ў Сібір. Там шмат жыло мамінай радні, у Іркуцку, ва Улан-Удэ. Ва Улан-Удэ я і трапіў у тэатральную студыю. Усё з-за дзяўчат... Але гэта доўгая гісторыя, калі вам цікава...

***— Вядома, цікава!***

— Мой старэйшы брат па заканчэнні школы з'ехаў. А яго аднакласніца была ў яго закаханая. І яна пачала дружыць са мной, каб захаваць адносіны з ім (ён не адказваў узаемнасцю). Тонкая, начытаная... Мы былі як брат з сястрой... Дзякуючы ёй я пачаў у пятнаццаць гадоў чытаць Станіслаўскага, цікавіцца тэатрам. Яна і даведалася пра вячэрнія тэатральныя курсы для працоўнай моладзі. Вучыліся там студэнты і служачыя, ну і я, школьнік. Выкладалі нам Грыгорый Іофін і Юрый Коршун. З «корачкай» тых курсаў я паехаў у Маскву, на акцёрскую біржу. І там пачалі звяртаць увагу на подпісы майго пасведчання. «Вы вучыліся ў Іофіна і Коршуна?» Вось пасля мне і патлумачылі, што нібыта кіраўнікі маёй студыі — рэпрэсіраваныя дзеячы з акружэння Меерхольда. Не ўпэўнены, ці праўда гэта.

***— А як прыйшлі ў рэжысуру?***

— Зноў шэршэ ля фам. Калі працаваў у Разані, адзін хлопец закахаўся ў нашу актрысу. Ён вучыўся ва ВГІКу на аператарскім. І каб зблізіцца са сваёй Валяй, здружыўся са мной. Пачаў прыходзіць да мяне ў тэатр. Я іх пазнаёміў... Ён шмат распавядаў мне пра свой інстытут. Я з ім туды ездзіў... І вырашыў: пайду таксама туды. На рэжысуру. Пасылаў работы, якія рыхтаваў для МГУ... Тады прымаў на свой курс Міхаіл Ром. І ён мяне ўзяў. Але дырэктар майго тэатра, каб не зрываць гастролі, не паказаў мне выклік на вучобу. Восенню я паехаў у Маскву, мне паказваюць дакументы — пазна, вось вас выклікалі, вы не прыехалі. Я засмуціўся, але тады не ўмеў лаяцца і змагацца, праглынуў... І на наступны год зноў падаў дакументы і паступіў, да Куляшова і Хахловай. Так што атрымалася, я два разы з першага разу паступіў ва ВГІК.

***— І як вы ўспрымалі легендарных Хахлову і Куляшова?***

— Ну што вы, карыфеі... Разбіралі нашы работы, запрашалі да сябе. Дзякуючы ім, я пазнаёміўся з Эльзай Трыяле, з яе сястрой Ліляй Брык... Эльза Трыяле пыталася, памятаю: «А что это у нас за юноши?» А Хахлова адказвала: «Гэта хлопчыкі з кухні». І смяялася... Так што ў нас быў такі жарт: мы — хлопчыкі з кухні... Пасля заканчэння ВГІК я яшчэ год боўтаўся ў Маскве (ні прапіскі, ні працы). І яны папрасілі мяне разабраць хатні архіў. Каб вы ведалі, што там было... Я бачыў запіскі Маякоўскага, Шклоўскага да Льва Куляшова... Запомніў цыдулку Маякоўскага: «Хватит трепаться, пошли к Лёвке жрать картошку».

***— У кінамастацтве абавязкова трэба быць вучнем майстра, каб адбыцца?***

— Так. А яшчэ будучы рэжысёр мусіць пабываць на здымачных пляцоўках у рознай якасці. Памятаю першую практыку на «Масфільме». Самсонаў здымаў фільм «Арэна». Падышлі да адміністратара, папрасілі, каб далі нам якую-небудзь працу. А там на падлозе павільёна пілавінне — фільм жа пра цырк. Блакітнае пілавінне, ружовае, яшчэ нейкае... Адміністратар кажа: «Перанясіце блакітнае пілавінне ўсё ў той кут павільёна. Лапаты там». Мы разгубіліся... Калі самі будзем лапатамі працаваць, трох тэрмінаў практыкі не хопіць. Але мы ж рэжысёры, мы мусім умець арганізоўваць! Знайшлі рабочага, паабяцалі бутэльку партвейну... Ён усё і зрабіў. А самі лупіліся: вунь Рыбнікаў у буфеце, вунь Беата Тышкевіч, якія ў яе ногі...



***— А беларускі перыяд вашай біяграфіі пачаўся выпадкова?***

— Калі пабываў на «Беларусьфільме» (у 1964-м у рэжысёра Фігуроўскага на здымках фільма «Сколько лет, сколько зим»), мама пісала мне: «Заставайся, гэта родная нам зямля». Падумаў, што прычынай — маміна начытанасць, бо пісаў Пушкін пра Беларусь «Народ издревле нам родной». Шмат пазней даведаўся, што мой дзядуля па маці Георгій Уладзіміравіч Курт нарадзіўся тут у 1892 годзе (роўна за 50 гадоў да майго нараджэння). Пакуль назапашваў падрабязнасці, усе родныя паўміралі (6 дачок і сын былі ў яго), так што дзе менавіта, у якім месцы ён нарадзіўся, як ён апынуўся ў Сібіры і сустрэўся ў Іркуцкай губерні з бабуляй (Нікіфарвай, дарэчы, Феафаніяй Сяргееўнай!) — застаецца таямніцай. Пакуль, спадзяюся.

***— Перш чым паўплываць на соцыум, рэжысёр уплывае на здымачную групу, на артыстаў... Тут у кожнага свая мадэль адносін. Неяк вы сказалі, што артыста трэба шчыра любіць...***

— Творчасць прадугледжвае ўнутраную свабоду. Ты робішся такім рэжысёрам, якім цябе зробіць твой характар, твая асоба, гэта не схаваеш. Але акрамя характару, ёсць непасрэдна дар, які сілкуе тваю ўнутраную волю. І ты мяняешся ў залежнасці ад матэрыялу, ад акцёра. Маім любімым артыстам быў Уладзімір Самойлаў. Ён зняўся ў дзевяці маіх фільмах. Самойлаў — вялікі артыст, я ўвогуле не асмеліўся б яго запрасіць, каб не мая асістэнтка Галя Камарова. Шукаем галоўнага героя фільма «Зімародак», нечага ўсё не хапае. Разгадкай стала фраза з аповесці Юрыя Якаўлева, па якой здымалі фільм: «Бываюць мужчыны, побач з якімі адчуваеш сябе сынам ці малодшым братам». Самойлаў менавіта такі... Я пасля пытаўся яго, чаму ён, зорка, пагадзіўся ў мяне, маладога рэжысёра, здымацца? Ён сказаў: спадабаўся эпізод, калі настаўнік па-хлапечы з'язджае па парэнчах, а пасля на вымову кажа: «Я больш не буду». Мне асабліва не трэба было нічога тлумачыць гэтаму артысту, ён адчуваў мяне, я адчуваў яго. Называў яго «дзядзька Валодзя». Неяк ён папрасіў: «Слава, ну што я цябе на «ты», а ты мне «Уладзімір Якаўлевіч»... Я кажу: «Не магу вам «ты» сказаць... Давайце буду вас называць «дзядзька Валодзя».

***— А як вы дапамагаеце артыстам знаходзіць ключ да іх ролі?***

— Згадаю выпадак з Вікай Таўстаганавай, якая сыграла галоўную ролю серыяла «Кат». Віка прачытала сцэнарый. У аснове — рэальная біяграфія «Тонькі-кулямётчыцы», якая працавала на нямецкіх акупантаў і расстраляла паўтары тысячы людзей. «Як гэта іграць?» І я кінуўся на дапамогу: «Пачытай «Медэю»... Пасля Заратустру... Ну і «Дэмана» Лермантава». Віка кажа: а «Дэмана» навошта? А там — ключ... Калі Дэман з нагоды таго, што на зямлі адбываецца, праліў слязу... І сляза Дэмана прапаліла скалу. Вось ключ... Надзвычайнае, «запредельное»... Сэнс у тым, не якая звароtлівая тварына гэтая гераіня, якая загубіла столькі бязвінных душ, а ў пластычнасці жаночай натуры, у нейкай звярынай волі да жыцця. Гэта яшчэ Станіслаўскага правіла: іграеш злога — шукай, дзе ён добры. І мая дапамога плюс майстэрства Таўстаганавай дазволілі ёй адкрыць глыбіні вобраза. «Запредельно» — было наша любімае слова на пляцоўцы. «Недостаточно запредельно, Вика!» Часам, калі спыняліся здымкі, я крычаў: «Багіня!». Вось гэта прыемныя моманты працы з добрымі акцёрамі. Дырыжор можа зразумець гэта. Але рэжысёр павінен умець адстойваць акцёраў. Канстанцін Эрнст хацеў, каб я ў серыяле «Кат» памяняў актрыс: каб Віка іграла іншую ролю. Я кажу: «Мяняйце. Толькі без мяне». І адстаяў. Неадназначнасць створанага вобраза — прыкмета таленту. Гэта сонм асацыяцый. І тады гледачу віртуальнае жыццё здасца важнейшым за рэальнае. Чаму некаторыя па пяць, дзесяць разоў і глядзяць любімыя фільмы... Магія мастацтва. Я складаў крытэрыі дабротнага сцэнарыя: тэматычная запатрабаванасць, якасны канфлікт... Парадокс, але ў фільме, у адрозненне ад жыцця, канфлікт заўсёды мусіць быць вырашаны — мо тады і ў жыцці нешта зменіцца.

***— Даводзілася чуць, што кінематограф маленькай краіны, у прыватнасці Беларусі, у прынцыпе не можа спаборнічаць з вядомымі кінаіндустрыямі...***

— Дзівіцца, калі беларускія кіназнаўцы так гавораць. Неяк тут быў вядомы рэжысёр Занусі, ён на падобнае пытанне здзівіўся — маўляў, у вас цудоўны балет, опера... Чаму пры падтрымцы дзяржавы не быць і цудоўнаму кінематографу? Кіно — гэта ўжо частка беларускай культуры, ад якой нельга адмовіцца. А да нацыянальнай культуры нельга падыходзіць як да асобнага твора з пункту гледжання крытычнага рэалізму. Гэта карані, вытокі, якімі сілкуецца любая творчасць. Ключавое слова тут — унікальнасць. Нацыянальная культура, нацыянальная гісторыя — непаўторныя. Пачынаючы з мовы. Нават калі адзін чалавек захацеў бы размаўляць на роднай мове — грамадства павінна стварыць яму для гэтага ўсе ўмовы. Мы цікавыя свету толькі сваёй самабытнасцю. Больш нічым не здзівіш. Даўно нехта навучыўся і мanipуляваць лепш, і бюджэт фільмаў недзе большы. Тое, што мы не звярнуліся да крыніц нацыянальнай беларускай культуры, не з іх пачалі адраджэнне беларускага кіно — вялікая памылка. Без гэтага колькі ні ўкладвай грошы, будзе атрымлівацца прадукцыя, падобная да кіно амерыканскага, кітайскага, індыйскага, якога заўгодна... А трэба — унікальнае, беларускае. Марыць пра камерцыйнае кіно... Але камерцыйнае кіно можа быць толькі там, дзе акрамя яго ёсць сапраўднае. Мы не можам пераўзысці іншыя студыі тэхналагічна. Каб вы бачылі студыі ў тым жа Кітаі! Памеры павільёнаў пачынаюцца ад дзесяці тысяч метраў. А ўявіце сабе басейн для падводных здымкаў, дзе субмарыны плаваюць! Унікальнасць найперш падразумявае гістарызм — у самым шырокім сэнсе. Разуменне таго, што было да цябе... Расповед пра народ, які адрозніваецца ад любога іншага, як адрозніваецца кожны чалавек — колерам вачэй, характарам, адбіткам пальцаў... Сербскі рэжысёр Кустурыца распавядаў пра сваіх герояў-дзівакоў — і ўвесь свет закахаўся ў яго народ. А беларускі народ — вельмі адметны. Ён перажыў генацыд, і трэба ў мастацтве асэнсоўваць, як паўплывалі на яго перажыты боль, сіла пакуты. Бо пакута — гэта не толькі падстава для аплаквання. У болю ёсць моц, штуршок да аднаўлення і абнаўлення. Пакута — рухавік жыцця... Не дарэмна ж гавораць, што ўсё, што нас не забівае, робіць нас мацнейшымі. Мудрэйшымі. Народ, які мае такі досвед болю і пакуты, непераможны, мудры і здольны да развіцця.

***— Вы кажаце пра ўменне творцы адстойваць сваё бачанне, пра ўнікальнасць кожнага акта творчасці... А як творцу быць, калі мастацкі савет: так нельга? Кіно — гэта ж індустрыя, тут адзін чалавек сваёй воляй нічога не зробіць.***

— Мастацкія рады існуюць на тое, каб з імі спрачацца і здабываць ісціну. Я гадоў шэсць быў мастацкім кіраўніком аб'яднання «Тэлефільм». Усе мастацкія рады я пачынаў фразай: «Мы тут сабраліся для таго, каб сказаць усё, што мы думаем, пра ваш сцэнарый, вашу працу. У вас ёсць адзіны спосаб вытрываць гэты націск — зрабіць па-свойму, выслухаўшы нас».

***— Але норавы ў кінематаграфічным асяроддзі складаныя...***

— Гэта так. Чаго толькі не бывае... Напрыклад, нехта хоча адпомсціць акцёру. Чуе — яго збіраюцца запрасіць на кастынг. «Ды вы што, ён даўно памёр!» Пусцілі чутку... І акцёру перастаюць тэлефанаваць, рабіць прапановы... Асабліва балюча, што ў Беларусі майстры-рэжысёры знаходзяцца ў прастоі. А кожны мог здымаць па фільме ў два-тры гады! Я палічыў: на восем вядомых рэжысёраў — 124 гады прастою! Я за апошнія дваццаць адзін год зняў адзін фільм. А куды плануюць прыстройваць маладых рэжысёраў, выпускнікоў акадэміі мастацтваў?

***— І ў чым выйсце?***

— Глабалізацыя можа паглынуць кветнік беларускай культуры, пазбавіць аблічча. Кінатэатры робяць планы на кіно замежным, расійскім. Але, памятаю, на прэм'еру свайго фільма «Тум-пабідум» я прыехаў у Бабруйск, вялікая зала, месцаў на чатырыста, і ўсе дзеці цягнуць рукі, каб задаць мне пытанне. Загадчыца паслала кажа: «А мы далі абвестку, што першыя дзесяць чалавек, якія зададуць пытанні, атрымаюць кантрамарку ў кінатэатр». Проста, эфектыўна... Што перашкаджае паўсюль нешта такое прыдумляць? А галоўнае — не трэба забываць, што ў цэнтры ўсіх тэхналогій заўсёды стаяў чалавек. Майстар.

**Гутарыла Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# Што яднае беларусаў?

## Рэжысёр свята на «Мінск-Арэне» Агата Мацко раскрывае свой погляд на галоўную тэму года



**17 верасня Беларусь адзначыла Дзень народнага адзінства — самае маладое дзяржаўнае свята ў гісторыі незалежнай Беларусі. Апагеем святкаванняў, якія прайшлі па ўсёй краіне, стала грандыёзнае гістарычнае шоу «НАША гісторыя» з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Больш за дзве гадзіны дзве з паловай тысячы артыстаў раскрывалі сутнасць беларускага адзінства з дапамогай музыкі, харэаграфіі, тэатральных замалёвак і маналогаў. Сведкамі маштабнага дзеяння сталі 10 тысяч гледачоў «Мінск-Арэны» і сотні тысяч тэлегледачоў, якія далучыліся да прамой трансляцыі на тэлеканале «Беларусь 1».**

**Што яднае беларусаў? У чым наша сіла? Як падаваць патрыятызм праз мастацтва? Падаваць так, каб мы з цікавасцю зноў і зноў перагортвалі старонкі гісторыі сваёй краіны, больш разумелі сябе як нацыю і асэнсавана давалі адзнаку тым падзеям, якія адбываюцца цяпер? Аб гэтым і не толькі мы паразважалі з галоўным рэжысёрам шоу Агатай МАЦКО.**

***— Агата, вы вядомы сваім уменнем ладзіць буйныя мерапрыемствы. Зразумела, маштабныя задачы патрабуюць і грунтоўнай падрыхтоўкі. З чаго звычайна ўсё пачынаецца?***

— Падрыхтоўка пачынаецца з пытання, пра што казаць. З ідэі. І тут ёсць два моманты, якія ідуць разам: прыдумаць ідэю і тыя дэкарацыі, у якіх яна будзе жыць. Ідэя шоу да Дня народнага адзінства прыйшла яшчэ ў лютым пасля таго, як мы правялі форум «У рэжыме праўды». 2022 год — «Год гістарычнай памяці», яму абавязкова патрэбна была кульмінацыя менавіта ў форме гістарычнага шоу. Першапачаткова хацелі правесці яго на стадыёне «Дынама». Ён добра падыходзіць для ажыццяўлення гэтай ідэі. Але ж абставіны накіравалі нас на «Мінск-Арэну», дзе мы ўжо працавалі. На гэты раз было вырашана, што усё люстэрка арэны будзе сцэнай, а падоўжаная форма подыума надасць адчуванне руху наперад. Дзякуючы гэтаму, нам удалося сцерці мяжу паміж гледачом і дзеяй.

***— Канцэптуальна да шоу «НАША гісторыя» вы падышлі вельмі глабальна. За дзве з паловай гадзіны, па сутнасці, расказалі і паказалі гісторыю Беларусі. Чаму вырашылі не абмяжоўвацца выключна перыядам найноўшай гісторыі?***

— Тэма яднання шматгранная. Мне было вельмі цікава прасачыць храналогію адзінства беларусаў ад зараджэння і да нашых дзён. І як тут не казаць пра хрысціянства? Па сутнасці, гэта самы галоўны прыклад адзінства народа, калі людзей аб'яднаў адзіны Бог. Падчас славянскага перыяду галоўная форма адзінства — сям'я, бо тыя плямёны, якія рушылі да нас, прыходзілі цэлымі сем'ямі. У песні так і пяецца: «За намі праўда, за намі род...» Вайна 1812 года. На тэрыторыі Беларусі ўзняўся моцны партызанскі рух. І тут я адкрыла шмат нечаканых фактаў. Моцна зацікавіла пытанне, чаму гэта вайна называлася Айчыннай? Адказ на яго ў нашым шоу, дзе мы раскрылі тэму простых людзей, якія пайшлі ў партызаны, каб абараніць сваю Радзіму. Ну, і, канешне, перыяд найноўшай гісторыі: падзел Беларусі ў 1921 годзе, аб'яднанне ў 1939-м,




Вялікая Айчынная вайна з яе стратамі і героямі, пасляваенны перыяд аднаўлення, Чарнобыльская трагедыя, атрыманне Беларуссю незалежнасці, наш час... У кожным гістарычным перыядзе былі і ёсць людзі, якія хочуць заставацца беларусамі. А наша задача цяпер — падаваць патрыятызм прыгожа і з душой. Толькі тады мы будзем цягнуцца да свайго і ганарыцца здабыткамі нашых продкаў.

***— Як вядома, адзін у полі не воін. Гэта датычыцца і рэжысёра. Хто ўваходзіць у вашу каманду і ў чым сакрэт добрай арганізацыі творчага працэсу?***

— Каманда, з якой я працую, сапраўды крутая. У ёй ёсць старэйшы і малодшы саставы. У старэйшы ўваходзяць выпускаючыя рэжысёры, малодшы складаюць студэнты-валанцёры. Галоўны сакрэт зладжанасці — усе самі па сабе павінны быць добрымі арганізатарамі і адказна кіраваць сваімі кірункамі. Для мяне ў рабоце з камандай ёсць такое важнае паняцце, як давер. Ён заснаваны на сяброўстве, павазе і творчасці. Калі на чалавека пастаянна ціснуць, то ён не праявіцца і будзе працаваць выключна па маёй камандзе. У нас жа сумесная творчасць ад самага першага этапу — абмеркавання ідэі — і да фінальных акордаў шоу.

***— Каго канкрэтна хацелася б адзначыць?***

— Сапраўдная зорка ў маёй камандзе — **Яна Калачынская**. На яе плячах — вельмі важная частка мерапрыемства — выбудоўванне дзейства ў адпаведнасці з тайм-кодамі. Здаецца, патрэбна стварыць простую табліцу ў Exel, дзе прапісаць час, калі змяняецца карцінка, калі гучыць тая ці іншая музыка, калі змяняецца свет, дэкарацыі... Але задача на самай справе складаная і адказная. На гэтай табліцы, па сутнасці, трымаецца ўсё шоу. І тут Яне няма роўных.

Не магу не сказаць пра ўнікальнага чалавека і музыканта **Яўгена Курчыча**. Падчас шоу «НАША гісторыя» Яўген поўнасцю адказваў за музычнае суправаджэнне. Гэта чалавек, які суткамі праводзіць у студыях гуказапісу. Стварае музыку, запісвае бэкі і свае сольныя нумары. Самае галоўнае, што падчас прагонаў ён разам з нашым гукарэжысёрам будуе ўсю лагістыку музычных трэкаў і кантралюе гэты працэс.

Я ганаруся тым, што са мной працуюць нашы топавыя харэографы: **Вольга Шамрова, Яўген Чарнышоў, Раман Кавалёў**. Зараз з'явіліся і маладыя харэографы — Андрэй Харловіч, Ігар Гелдзінскі. Кожны з іх адказвае за свой стылістычны напрамак. А жанраў падчас шоу шмат: ад сучаснасці да аўтэнтыкі.

Яшчэ адзін важны напрамак дзеі — відэаграфія. За яе адказваюць Яўген Камароўскі, Багдан Карпаў і я. Чаму я? Я заўсёды ўсё ўспрымаю візуальна, таму мае шоу і канцэрты заўсёды выглядаюць выйгрышна візуальна. Да ўдзелу ў стварэнні відэакантэнту да мерапрыемстваў я прыйшла тады, калі стамілася тлумачыць рэжысёрам, як трэба зрабіць. Як кажуць, лепш адзін раз паказаць. У шоу «НАША гісторыя» я асабіста стварыла некалькі візуальных частак. Сярод іх — блокі, прысвечаныя асветніцтву, вайне 1812 года, Чарнобылю і інш.

***— Як трапіць да вас у каманду?***

— Трапіць у нашу каманду складана, але рэальна. Проста патрэбна быць вельмі таленавітым і добрым чалавекам. І, безумоўна, ставіцца з вялікай павагай да сваіх калег і артыстаў. Хамства ў нашай камандзе забаронена. За яго праяўленне я нават магу развітацца з чалавекам. Калі ёсць жаданне працаваць з намі, можна проста напісаць мне ці Яне.

***— Наколькі рэальна на сто працэнтаў падчас падрыхтоўкі да шоу прадбачыць эмоцыі зала?***

— На сто працэнтаў гэта прадбачыць немагчыма. Канешне, ёсць кампазіцыі, якія заўсёды выклікаюць пэўную рэакцыю. Напрыклад, песня «Помніце» ў выкананні заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Вікторыі Алешкі. Зала заўсёды слухае яе стоячы. На гэты раз для мяне была нечаканай рэакцыя залы на прэм'ерную кампазіцыю «Боль зямлі» ў выкананні народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі і ансамбля «Сябры». Аўтары песні — Яўген Алейнік, Юлія Быкава і Ганна Сялук.

***— Гучыць фінальная кампазіцыя, вядучыя і артысты на сцэне. Якімі словамі ў гэты момант можна апісаць вашы эмоцыі?***

— Калі артысты пачалі разыходзіцца са сцэны пасля фіналу, я заплакала. Гэты праект аказаўся вельмі эмацыянальным і рызыкоўным. Мы стварылі яго фактычна за паўтара тыдня, а для такога маштабу гэта вельмі маленькі тэрмін.

***— За што вы любіце сваю работу?***

— Я люблю сваю работу за тое, што я маю магчымасць быць у розных месцах, у розных светах і магу стварыць іх сама. Гэта ўнікальнае адчуванне, калі ты можаш ствараць некалькі дзясяткаў светаў тут і зараз.

***— Дзе знаходзіцца крыніца вашага натхнення на новыя праекты і прафесійны рух?***

— Кожны раз па-рознаму. Ідэі могуць ісці ад музыкі, а могуць — ад відэарэферэнсу. Даволі часта ідэі прыходзяць, калі я гуляю раніцай з сабакам. Ты ідзеш па лесе, слухаеш музыку, і ўсё — нараджаюцца вобразы.

***— Ваш профіль у «Інстаграм» называецца «Arttouristo». Ёсць адчуванне, што ў прафесійным сэнсе вы адкрыты свету. Ці ёсць у планах праца не толькі ў Беларусі, але і па-за яе межамі?***

— Планы ёсць — не хапае часу. Зараз я накіроўваюся ў Казахстан, дзе планую і адпачыць, і крыху папрацаваць. У Маскве таксама ёсць прапановы. Але родная Беларусь, канешне, у прыярытэце, бо зараз тут ёсць падтрымка, давер і магчымасці для таго, каб ствараць штосьці новае і добрае.

***— Як пяецца ў вядомай кампазіцыі групы «Queen», «Show must go on...» Якім будзе наступнае шоу Агаты Мацко?***

— Спадзяюся, яно будзе наваодгнім *(смяецца)*. Хоць работы шмат. Напрадзе юбілей Палаца Рэспублікі. Акрамя таго, разам з Юліяй Быкавай і Яўгенам Алейнікам рыхтуем сольны канцэрт групы «Аўра». Так што будзем працягваць вас здзіўляць!

**Гутарыла Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва Агаты МАЦКО.**

Тэатр

# БУНТ МАЛАДЫХ СУПРАЦЬ ЗАГАН ЧАЛАВЕЦТВА

## Прэм'ера «Гарачага сэрца» ў Купалаўскім

**У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы адбылася прэм'ера спектакля «Гарачае сэрца». Рэжысёр пастаноўкі Валянціна Еранькова прадставіла гледачам сваю інтэрпрэтацыю п'есы Аляксандра Астроўскага.**

У пастаноўцы адлюстравана барацьба двух сусветаў — матэрыяльнага і духоўнага. Рэчаіснасць купца Куралесава і яго жонкі Матроны Харытонаўны нагадвае сон падчас хваробы. Іх хаатычны шлях перамяжоўваецца скаргамі і скандаламі. Героі знаходзяцца ў шлюбе толькі намінальна: у іх зносінах няма ні шчырасці, ні павагі, ні пяшчоты. Таісія Увядзенская, якая выконвае ролю Матроны, паспяхова стварае вобраз жорсткай, мэтанакіраванай жанчыны, якая пры ўсім гэтым яшчэ і разумнейшая за свайго мужа. У ролі Куралесава выступае Уладзімір Іваноў, які адлюстроўвае цынічнага чалавека з вялікімі амбіцыямі.



Стваральнікі пастаноўкі выкарысталі цікавы прыём: яны асучаснілі народныя песні. Так, падчас спектакля можна пачуць «Чорнага ворана» і «Гусі-гусі» ў поп-апрацоўцы, кампазітарскай работай займаўся Аляксей Еранькоў. Нягледзячы на тое што падзеі адбываюцца прыкладна ў 1830-х гадах, пластычныя танцавальныя рухі герояў адсылаюць гледача не да старонак гісторыі Расійскай імперыі, а хутчэй да сучаснай танцавальнай студыі. У нейкі момант на сцэне можна ўбачыць нават імправізаваную барацьбу за мікрафон: кожны хоча праспяваць сваю частку песні як мага больш яскрава. Праз зразумелыя паралелі з сучаснасцю, алюзіі на шоу-бізнес, поп-індустрыю, больш відавочным малюецца сусвет п'есы: бессэнсоўная канкурэнцыя, пагоня за матэрыяльным дастаткам, уніфікацыя грамадства.

Прадстаўніком старога, прагнілага сусвету таксама выступае і адзін з маладых герояў, Вася Шустры. Ролю баязлівага хлопца выконвае Ілья Крук. Адзін з найлепшых эпізодаў спектакля — дыялог паміж Параскай і Васем. Дзяўчына кажа аб тым, як моцна кахае Васю, як ужо не можа чакаць яго прапановы рукі і сэрца. Унутры Парaскі вір эмоцый: стомленасць, гнеў, каханне, надзея. На што Вася адказвае так: «Ну, паглядзім. Калісьці мы абавязкова ажэнімся». Ілья Крук выдатна стварае вобраз прыстасаванца, чалавека, які баіцца абавязкаў. У акцёра атрымліваецца перадаць камічнасць свайго героя: глядач не злуецца на Васю, а смяецца з яго.

Маральным арыенцірам сусвету п'есы становіцца Параска, ролю якой выканала Юлія Аўчыніна. Адметна, што Параска ў выкананні актрысы — гэта не ціхая, лагодная дзяўчына. Яна не трывае хлусні і здрады, адразу выказвае незадаволенасць. З-за гэтай рысы характару Параска ўвесь час канфліктуе з бацькам і мачахай, не знаходзіць разумення і сярод іншых герояў. Але, вырашаючы пераламіць звыклы ўклад, адразу робіць правільны крок: пачынае трансфармацыю з сябе, а толькі потым звяртаецца да іншых персанажаў, каб дапамагчы ім адшукаць сапраўдны шлях. Хлопец Гаўрыла кахае Параску, але на працягу п'есы не знаходзіць узаемнасці. Гэта і становіцца яго галоўнай мэтай, да якой ён паступова рухаецца. Іван Аксенчык у ролі Гаўрылы таксама выглядае прадстаўніком новага, правільнага сусвету. Асабліва на кантрасце з Васем відаць яго ўнутраны стрыжань, які ў выніку і дапамагае хлопцу дасягнуць пастаўленай мэты.

Нельга не адзначыць і глядацкую рэакцыю: наведвальнікі жыва адгукаліся на жарты герояў. Змяняюцца эпохі, а людскія недахопы застаюцца такімі ж: жаданне ўрваць як мага больш грошай, выкарыстаць адзін аднаго ва ўласных мэтах. Будуючы на заганах чалавецтва камічныя сітуацыі, стваральнікі спектакля атрымалі чаканы зварот: гледачы зразумелі іх пасыл.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ЛОВИ УДАЧУ 3»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Лови удачу 3» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Лови удачу 3» (далее – Рекламная игра).

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Триовист» (далее – Организатор). УНП 190806803.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190806803 решением Минского горисполкома от 22 февраля 2007 года № 339.

Место нахождения Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й эт.

Почтовый адрес Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, 220020, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й эт.

Адрес электронной почты: info@21vek.by.

**2. Наименование рекламной игры.**

Наименование Рекламной игры – «Лови удачу 3».

**3. Территория проведения Рекламной игры.**

Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения Рекламной игры.**

Срок начала Рекламной игры: 26 сентября 2022 года.

Срок окончания Рекламной игры: 24 января 2023 года (включая период розыгрыша и выдачу призов, опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Организатором создана Комиссия по проведению Рекламной игры (далее – Комиссия) в следующем составе:
Председатель Комиссии: Басалыга Анна Мария Андреевна, ведущий специалист по маркетингу ООО «Триовист».

Члены Комиссии:
1. Дехтяр Алина Вадимовна, начальник юридического отдела ООО «Триовист»;
2. Ганисевская Варвара Сергеевна, ведущий юрисконсульт ООО «Триовист»;
3. Шимко Карина Сергеевна, специалист по маркетингу ООО «Триовист»;
4. Дашкевич Ангелина Леонидовна, маркетолог ООО «Триовист»;
5. Довнар Никита Сергеевич, бизнес-аналитик ООО «Удобные финансы».

**6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующего товара: Наклейка фирменная 21vek Круглая / 6282249 код на сайте: 6.266.107

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут быть:

- граждане Республики Беларусь, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;
- иностранные граждане, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь;
- лица без гражданства, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь.

К участию в Рекламной игре допускаются физические лица, выразившие желание принять участие в Рекламной игре, заказывающие, приобретающие или использующие Игровые товары исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, отвечающие требованиям правил проведения Рекламной игры на условиях, предусмотренных в правилах проведения Рекламной игры.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. К участию не допускаются члены Комиссии.

Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо:

7.1. В период **с 26 сентября 2022 г. по 26 ноября 2022 г. включительно:**

7.1.1. Изучить правила проведения Рекламной игры, размещенные на сайте www.21vek.by.

7.1.2. Оформить на сайте интернет-магазина www.21vek.by заказ Игрового товара, при этом подтвердив согласие на участие в Рекламной игре на сайте интернет-магазина www.21vek.by.

7.1.3. Заполнить форму интернет-заказа, указав следующие данные:

фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, если таковое имеется);

абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно);

адрес электронной почты (обязательно).

7.1.4. Оплатить заказанный Игровой товар в соответствии с выбранным условием оплаты, представленными на сайте интернет-магазина www.21vek.by.

После оплаты Игрового товара Участнику присваивается Игровой код, который представляет из себя девятизначный номер, идентичный номеру заказа, в котором приобретался Игровой товар.

Игровой код начинает действовать со следующего дня после даты оплаты Игрового товара.

7.2. В период с **27 сентября 2022 г. по 27 ноября 2022 г.** включительно:

7.2.1. Зарегистрировать Игровой кода на сайте https://happy21vek.by/, подтвердив согласие на участие в Рекламной игре, подтвердив согласие на обработку, хранение и использовании персональных данных в рамках проводимой Рекламной игры.

Для регистрации Игрового кода Участнику необходимо полностью заполнить форму регистрации Игрового кода, указав следующие данные:

девятизначный номер игрового кода;

фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, если таковое имеется);

абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно);

адрес электронной почты (обязательно)

7.2.2. После регистрации Игрового кода выбрать на сайте https://happy21vek.by/ категорию приза в розыгрыше которого будет принимать участие Игровой код.

Покупатель становится Участником Рекламной игры при выполнении всех условий правил.

Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии оплаты каждого Игрового товара в отдельном заказе и выполнения остальных требований, необходимых для участия в Рекламной игре. Для участия в Рекламной игре достаточно приобрести один Игровой товар.

Один Игровой код может принимать участие в розыгрыше только одной выбранной категории приза. При наличии у Участника нескольких зарегистрированных Игровых кодов Участник по своему выбору определяет к каждому Игровому коду категорию приза, в розыгрыше которого тот будет принимать участие. После выбора категории приза Игровой код не может быть перенесен в иную категорию.

Один Игровой код может принимать участие в Рекламной игре только 1 (один) раз. При наличии у Участника нескольких Игровых кодов каждый из них должен быть зарегистрирован.

**8. Призовой фонд Рекламной игры.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора.

Призовой фонд состоит из Призов, общее количество которых составляет 255 единиц (штук), **общий размер призового фонда составляет 79 298,98 бел. руб.:**

| № | Наименование приза | Категория приза | Количество, шт. | Цена, бел. руб., 1 шт. | Общая сумма, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Домашняя мультимедийная платформа «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение) Цвет синий. Артикул 00020B, страна происхождения Китай | **Умная колонка Яндекс Станция Новая Мини с часами YNDX-00020B (синий)** | 3 | 209,88 | 629,64 |
| | Денежные средства в размере 7,30 бел. руб. | | 3 | 7,30 | 21.90 |
| 2 | Наушники пользовательские JBL T100TWSBLK, страна происхождения Китай | **Беспроводные наушники JBL T100 TWS / T100TWSBLK (черный)** | 3 | 72,00 | 216,00 |
| 3 | 155 X 60 см СПА бассейн Vancouver Air Jet Plus, арт. 60027, страна происхождения Китай | **Бассейн-джакузи Bestway Vancouver AirJet Plus 60027 (155x60)** | 1 | 2255,33 | 2255,33 |
| | Денежные средства в размере 312,94 бел. руб. | | 1 | 312,94 | 312,94 |
